ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дармовым дадаткам „Прафрух")

На 1 мес.	— 90 к.
„ 3 мес.	2 р. 60 к.
„ 6 мес.	5 р. —
„ 12 мес.	9 р. 75 к.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок нонп. пасля тэксту—50 к., іншагароднія абвесткі—1 р. за радок. Паперод тэксту—у два разы дарожай. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Зьвыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—31 г. біржэвыя 10 проц. надбавкі.

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
» абвестак . . 7-81

ПАНЯДЗЕЛАК, 8 верасьня 1930 г.
№ 210 (3048)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

ЧАЦЬВЕРТЫ ДЗЕНЬ ШТУРМУ

Дрэваапрацоўшчыкі і абутнікі ўключыліся ў паход супроць канкрэтных вінаватых у прарывах

Галавацяпская пастанова гомельскага акрвыканкому. Згубленая дырэктыва барысаўскага райкому.

АГОНЬ ПРАЛЕТАРСКАЙ САМАКРЫТЫКІ ПА ТЫХ, ХТО ЗАГАРОДЖВАЕ ШЛЯХ ДА ПЕРАМОГІ, ХТО ЗАТРЫМЛІВАЕ НАСТУПЛЕНЬНЕ ШТУРМУЮЧЫХ КАЛЁН!

22 ДНІ засталося да ліквідацыі запазычанасьці другога году пяцігодкі.

НАВЯРСТАЦЬ УПУШЧАНАЕ

Мы ня маем дакладных вестак аб жнівеньскіх хлебазагатоўках. Афіцыяльная зводка Саюзхлеба асноўваецца толькі па вестках, прысланых 69 раёнамі БССР. Рэшта раёнаў маўчыць. Цэнтральныя загатоўчыя арганізацыі да гэтага часу не зьвязаліся з імі.

Такім чынам, савецкая грамадзкасьць яшчэ не знаёма з ходам важнейшай палітычнай і гаспадарчай кампаніі. Гэта становішча нельга прызнаць нармальным, тым больш, што адрывачныя весткі, якія мы маем, гавораць **аб буйнейшых зрывах.**

Жнівеньскі плян, мяркуючы па зводцы Саюзхлеба, выкананы **толькі напалову.** Наўрад ці раёны, з якімі няма сувязі, значна павялічаць агульны рэспубліканскі процант. Наадварот, можна баяцца, што якраз у гэтых раёнах збожжа загатаўляецца горш, чым у іншых, што выказвае жыцьцё.

Моцна адстае індывідуальны сэктар. У той час, як калгасы выканалі 125 проц. двухмесячнага пляну (ліпеньскага і жнівеньскага) — адзіначасобнікі здалі толькі 48,4 проц. Гаменна плятуцца ў хвасьце саўгасы—8,3 проц. Іх у шэсьць разоў выперадзіў індывідуальны сэктар.

Выклікае сур'ёзную небясьпеку якасьць збожжа, якое загатаўляецца. На асыпныя пункты паступае збожжа з **вялікай вільготнасьцю** — да 20-22 проц. І трэба з усёй рашучасьцю падкрэсьліць, што ня толькі адзіначасобнікі, але і асобныя калгасы і саўгасы здаюць нядобраякаснае збожжа. На такіх рвацкіх тэндэнцыях, па такіх спробах прадаваць дзяржаве сапсаваны прадукт — трэба бязьлітасна ўдарыць.

Мясцовыя арганізацыі тлумачаць слабае разгортваньне кампаніі няспрыяючым надвор'ем і затрыманьнем уборкі і абмалоту. Наўрад ці гэтыя абмаўданьні могуць заслугоўваць сур'ёзнай увагі. Бо і павольны абмалот збожжа ў значнай меры выкліканы нераспарадчасьцю мясцовых арганізацый. Няпоўная нагрузка малатарань, адсутнасьць узаемадапамогі паміж калгасамі, саўгасамі і адзіначасобнымі гаспадаркамі, — усё гэта—добра вядомыя аб'ектыўныя прычыны, якія можна перамагчы пры поўнай настойлівасьці і ініцыятыве. З другога боку, загатоўкі ідуць павольна і ў тых мясцох, дзе ўборка і абмалот збожжа канчаюцца.

Дык у чым-жа прычыны хлебазагатоўчых прарываў? Яны перш за ўсё **ў непадрыхтаванасьці хлебазагатоўчага апарату, у злачынна слабай рабоце шмат якіх нізавых партыйных і савецкіх арганізацый па мабілізацыі сельскай грамадзкасьці.** Яны — у самацёчных настроях, праваапартуністычнай стаўцы па «авось». Яны—у разгаворчыках, што часу яшчэ наперадзе шмат, што кулак ужо нібыта канчаткова разьбіты.

Да гэтага часу пляны загатовак не даведзены да асобнай вёскі і калгасу, ня гледзячы на неадпаразовыя паказаньні цэнтральных партыйных арганізацый.

Да гэтага часу надзвычай слаба праводзіцца кампанія самаабвязацельстваў бядняцка - сярэдняцкіх гаспадарак.

Да гэтага часу ў шмат якіх раёнах фактычна адсутнічаюць камісіі садзейнасьці. Няма сацыялістычнага спаборніцтва і сустрэчных прамфінпляпаў. Не разгорнута работа сярод беднаты. Няма належнага адпору кулацтву.

У гэтых адносінах вельмі характэрна практыка **Касьцюковіцкага** раёну. У Батаеўскім сельсавеце гэтага раёну бедната зусім ня была прыцягнута да абмеркаваньня пляпаў. У выніку агульныя сходы вынесьлі пастанову: «Унесьці збожжа. колькі магчыма, — пароўнаму». Выбары камісій садзейнасьці былі правалены. У вёсцы Бароўка, Студзянецкага сельсавету, сход адмовіўся разглядзець плян загатовак і ўпаўпаважаны РКК у адміністрацыйным парадку давёў яго да вёскі. Аналёгічны малюнак і па некаторых іншых сельсаветах раёну.

У чым-жа справа? Мясцовыя арганізацыі забыліся, што **масавая работа сярод беднаты — зарука посьпеху загатовак.** Забыліся, што неабходна мабілізаваць бядняцка - сярэдняцкія масы для адпору клясаваму ворагу.

Бязьдзейнасьць партыйных ячэек і сельсаветаў скарыстана кулаком. І ня дзіва, што абмеркаваньне пляпаў было правалена менавіта ў тых вёсках, дзе яны ня былі наперад абгавораны на сходах беднаты.

Мы невыпадкова так падрабязна спыніліся на карэспандэнцыі з Касьцюковіцкага раёну. Яна яскрава гаворыць пра праваапартуністычную недаацэнку актыўнасьці кулака. Яна сыгналізуе пра слабы адпор клясаваму ворагу.

Трэба канстатаваць, што і ў шэрагу іншых раёнаў націск на кулака абсалютна невыстарчальны. Ня ўсюды яму прад'яўлены цьвёрдыя заданьні. Ня ўсюды забясьпечана іх выкананьне. Толькі гэтым можна вытлумачыць, што па Слуцкім раёне да гэтага часу кулакі ня здалі **ніводнага кілёграму збожжа.**

Адначасова з прымірэнцтвам да кулака ня выжыты яшчэ перагібы ў адносінах да серадняка. Замест масавае растлумачальнае работы, замест мабілізацыі вясковай грамадзкасьці, некаторыя месцы пайшлі па шляху паменшага супраціўленьня, па шляху **адміністраваньня.** Забываючыся на цьвёрдыя пляны для кулака, даводзяць пляны да сераднякоў і беднякоў. Не дабіраючы ў кулакоў і заможных, устанаўляюць ураўнілаўку. Не зважаючы на шматлікія папярэджаньні ЦК, да бядняцка - серадняцкіх мас ужываюць тыя-ж спосабы ўзьдзеяньня, што і да клясавых ворагаў.

У «Зьвязьдзе» гэтымі днямі быў апублікаваны вялікі матар'ял пра скажэньне клясавае лініі на мясцох. Гэтыя паведамленьні заслугоўваюць пільнае ўвагі. Бо ня толькі асобныя ячэйкі, ня толькі асобныя сельсаветы, але і нават некаторыя раённыя камітэты давалі дырэктывы пра даваздзеньне пляпаў да асобнага двара, якія ня мелі нічога агульнага з партыйнай лініяй.

Адміністраваньне, ураўнілаўка, перагібы ў адносінах да серадняка — простая дапамога кулаку. Партыя бязьлітасна ўдарыць па памоцніках клясавага ворага, вольных ці навольных. **Партыя не дапусьціць як прымірэнчых адносін да кулака, так і адміністрацыйных наскокаў на серадняка.**

Вышэйшыя партыйныя органы ня раз папярэджвалі, што работа па ліквідацыі акруг ніякім чынам не павінна ўплываць на правядзеньне важнейшых палітычных і гаспадарчых кампаній. Наадварот, адміністрацыйная рэформа, узмацняючы раёны, павінна дапамагаць пасьпяховаму правядзеньню кампаній. Гэтага, на жаль, няма. Папярэджаньні ЦК КП(б)Б, відавочна, ня ўсімі пачуты. Мы паказвалі ўжо на адсутнасьць сувязі з раёнамі. Цэнтральныя загатоўчыкі ня ведаюць, што робіцца на мясцох. Акрганделі ліквідуюцца, **райгандлі яшчэ не сфармаваны.** Хто-ж кіруе загатоўкамі? Хто рэгулюе работу нізавых загатоўчых пунктаў? І гэта ў разгар кампаніі, калі дарагі кожны дзень, кожная гадзіна. Што-ж дзіўнага тады ў тым, што ў шасьці раёнах да 25 жніўня загатоўкі зусім не пачаліся.

Савецкая грамадзкасьць мабілізуецца для ўзмацненьня загатовак у індывідуальным сэктары, друк б'е трывогу з прычыны слабога паступленьня збожжа ад адзіначасобнікаў. А ў той-жа час сялянам - адзіначасобнікам, якія прывезьлі ў Слуцак за 70 вёрст са Старобінскага раёну збожжа, даводзілася літаральна прасіць прыняць у іх яго. «Вы ня з нашага раёну», — адказвалі каапэратары. Сяляне дамагліся, зламалі ўпартасьць слуцкіх бюракратаў. А вось, як паведамляюць з вёскі Пацолтава, Мсьціслаўскага раёну, абоз адзіначасобнікаў вярнуўся назад: каапэратары адмовіліся яго прыняць.

Ці не зьяўляюцца гэтыя факты красамоўнай ілюстрацыяй для тэй безадказнасьці, якая ўсё яшчэ пануе ў хлебазагатоўчым апараце?

Верасень — рашаючы месяц загатовак. Ня толькі выканаць верасьнёвыя пляны, але і **навярстаць упушчанае.** Гэтага патрабуе ад усіх арганізацый партыя, гэтага вымагаюць патрэбы **сацыялістычнага будаўніцтва.** Час пакончыць з ганебнымі праваламі. Час дамагчыся сапраўднага зруху.

Белагвардзейшчына зноў падымае галаву на К.-Усх. чыгунцы

ТОКІЁ, 30. Харбінскі эміграцкі орган «Русское Слово» цьвердзіць, што «ў эміграцкіх колах пашыраны чуткі аб падрыхтоўцы прадстаўнікамі атамана Сямёнава новага антысавецкага выступленьня на Манчжурыі». Кітайскімі ўладамі затрыманы ля Харбіну 14 рускіх, у якіх знойдзены гранаты. Як паведамляе газэта, арыштаваныя пацьвердзілі, што яны зьяўляюцца белымі. Гранаты, паводле іх слоў, падрыхтаваны імі для «зьвядзеньня парахункаў з савецкімі дзеячамі». (ТАСС).

На мітынгу рабочых заводу «ЭНЭРГІЯ». Абрубшчык ліцейнага цэху тав. МАРАЗОЎСКІ заклікае ўсіх рабочых стаць ударнікамі імя 3-га году пяцігодкі.

Абутнікі зварухнуліся
УСЕ СІЛЫ—НА ЛІКВІДАЦЫЮ ПРАРЫВУ!

Апошнія два дні далі пэўны зрух на абутковай фабрыцы ў сэнсе практычнае рэалізацыі адозвы ЦК УсеКП(б).

Як вядома, першыя лічбы верасьня былі паказчыкамі зрыву прамфінпляну на прадпрыемстве. Зараз ударнымі тэмпамі мабілізуецца ўся рабочая грамадзкасьць на неадкладнае выпраўленьне дапушчаных хібаў.

Прарыў (і даволі значны) абумовілі: ПАДЗЕНЬНЕ ПРАЦОЎНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ, ЦЯКУЧАСЬЦЬ РАБОЧАЕ СІЛЫ І ПАСЛАБЛЕНЬНЕ ПАРТЫЙНА-ПРАФСАЮЗНАЕ РАБОТЫ НА САМОЙ ФАБРЫЦЫ.

6 і 7 верасьня ў цэхах праводзіліся пазьменна партыйна-камсамольскія сходы. На сходах актуальнейшым пытаньнем зьяўлялася хутчэйшая ліквідацыя прарыву. Учора-ж на фабрыцы адбыўся адкрыты сход парткалектыву, дзе шырока абгаварваліся мерапрыемствы, зьвязаныя з падрыхтоўкай ДА ДНЯ ЎДАРНІКА.

Мяркуецца, між іншым, паставіць справу так, каб ЗЬМЕНЫ РАБОЧЫХ ЧАРГАВАЛІСЯ НА ХАДУ, па сваеасабліваым канвэеры. Такім чынам, НІ НА ХВІЛІНУ НЯ СПЫНІЦЦА ПРАЦЭС ВЫТВОРЧАСЬЦІ.

Шмат дасьць таксама належная рацыяналізацыя працы. Вызначана прэміяваньне лепшых ударнікаў, а таксама вылучэньне іх у розныя фабрычныя арганізацыі ў якасьці рацыяналізатараў і г. д.

Дагэтуль далёка ня ўсе аб'екты прамфінпляну прапрацоўваліся ў брыгадах. Напрыклад, ЗЬНІЖЭНЬНЕ САБЕКОШТУ ЗУСІМ ВЫПАЛА З-ПАД УВАГІ. У самым бліжэйшым часе гэты недахоп будзе выпраўлены.

Сёньня, пасьля работы, на фабрыцы адбудзецца мітынг. Усе закранутыя ў адозьве пытаньні, у іх дачыненьні да ўмоў фабрыцы, на гэтым мітынгу будуць дэталёва абмеркаваны.

9-га верасьня — нарада брыгадзіраў па пытаньні ўзьняцьця якасьці прадукцыі. 12 верасьня — агульна-фабрычны зьлёт ударнікаў.

На зьлёце ў сваю чаргу будзе абгаворана адозва ЦК.

Учарайшы дзень практычна давёў паляпшэньне ў справе змаганьня за прамфінпляп другога году пяцігодкі. У той час, калі папярэднія 3-4 дні паказвалі недавыкананьне гатовае прадукцыі на некалькі сот пар абутку, сутачны рапарт ЗА 7 ВЕРАСЬНЯ гаворыць наступнае:

— ПАВОДДЕ ПЛЯНУ ТРЭБА ВЫПУСЬЦІЦЬ 3.350 ПАР АБУТКУ; ВЫПУШЧАНА-Ж 3.428. ПЕРАВЫКАНАНЬНЕ — 78 ПАР.

Паволька, але відавочна наступае ПЕРАЛОМ.

Даволі зазначыць, што за апошнія 16 дзён сабрана БОЛЬШ 60 ДЗЕЛАВЫХ ПРАПАНОЎ РАБОЧЫХ. 13 ЧАЛАВЕК ПРЭМІЯВАНЫ.

Фабрычныя арганізацыі павінны толькі накіраваць актыўнасьць мас па тым рэчышчы, у якім яна дасьць найлепшы эфэкт. ЮР.

Пачын аўтаматнага цэху

БАРЫСАЎ. (Па тэлефону). Не чакаючы паказаньняў райкому партыі, арганізацыі ф-к «Чырвоная Барэзіна» і «Пралетарская перамога» разгарнулі прапрацоўку адозваў ЦК УсеКП(б) і ЎсеЦСПС.

Яшчэ 5-га верасьня на экстранай нарадзе «трыкутнікаў» цэхаў разам з інжынэрна-тэхнічным персаналам выпрацаваны канкрэтны плян ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі. У пляне —арганізацыя «сквозных» брыгад па ўсіх галінах вытворчасьці, прымацаваньне адказных работнікаў да цэхаў для дэтальнай прапрацоўкі сустрэчнага прамфінпляну і г. д. Адміністрацыі прапанавана даць кожнаму цэху і варштату цьвёрдае заданьне на кожны дзень да канца бягучага гаспадарчага году, трымаючы курс на ліквідацыю прарываў.

Рабочыя аўтаматнага цэху «Пралетарскай перамогі» ў колькасьці 40 чал. учора падалі заявы з абавязацельствамі—не пакідаць фабрыку да канца пяцігодкі. Гэта—першыя падобныя заявы на барысаўскіх прадпрыемствах.

Не дапусьцім зьніжэньня тэмпаў

Дзень ударніка--дзень агляду баявых сіл

Мы, рабочыя швэйнай фабрыкі «Кастрычнік», У КОЛЬКАСЬЦІ 2.000 ЧАЛАВЕК, сабраўшыся на мітынг для абмеркаваньня адозваў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б, заяўляем: што, дабіўшыся выкананьня праграмы за 11 месяцаў на 110 проц., мы надалей НЕ ДАПУСЬЦІМ ЗЬНІЖЭНЬНЯ ГЭТЫХ ТЭМПАЎ.

Мы запэўняем камуністычную партыю, што прарыў, які вызначыўся ў нас па выкананьні прамфінпляну за першую пяцідзёўку верасьня, мы ліквідуем НЕ ПАЗЬНЕЙ 15 ГЭТАГА МЕСЯЦА.

Заяўляем, што ў трэці год пяцігодкі мы ўступім з такім-жа баявым, бальшавіцкім энтузіязмам і выканаем прамфінплян 1930-31 году з посьпехам.

Масавая прапрацоўка сустрэчнага прамфінпляну, якая выпілася ў нас у масавую палітычную кампанію, зьяўляецца зарукаю нашага абяцаньня. Яшчэ шырэй разгарнуўшы ва ўсёй нашай рабоце мэтад сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, мы абавязуемся ўзьняць прадукцыйнасьць працы ў 1930-31 годзе НА 24 ПРОЦ.

Мы цалкам і поўнасьцю ўхваляем адозву ЦК УсеКП(б) і прапануем фабкому арганізаваць масавую прапрацоўку гэтае адозвы, каб яе ўсьвядоміў КОЖНЫ РАБОЧЫ Ў ПААСОБКУ.

ВЫЛУЧЫЦЬ БРЫГАДЫ ДЛЯ ПРАВЕРКІ СТАНУ РАБОТЫ НА НАШАЙ ФАБРЫЦЫ ПА ЎСІХ ПУНКТАХ АДОЗВЫ ЦК УсеКП(б).

Мы поўнасьцю далучаемся да пастановы ЎсеЦСПС аб арганізацыі ЎСЕСАЮЗНАГА ДНЯ ЎДАРНІКА 1-ГА КАСТРЫЧНІКА і абяцаем абярнуць гэты дзень У ДЗЕНЬ АГЛЯДУ БАЯВЫХ СІЛ УДАРНІКАЎ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА І СУСТРЭЧЫ НОВАГА ГАСПАДАРЧАГА ГОДУ.

Мы прапануем арганізаваць УСЕСАЮЗНЫ, ВЫТВОРЧЫ МІТЫНГ-ПЕРАКЛІЧКУ ДЛЯ ПРАВЕРКІ І АКАЗАНЬНЯ ДАПАМОГІ ПРАДПРЫЕМСТВАМ, ЯКІЯ АДСТАЮЦЬ У СПРАВЕ ПРАПРАЦОЎКІ СУСТРЭЧНАГА ПРАМФІНПЛЯНУ І ЛІКВІДАЦЫІ ПРАРЫВАЎ.

З нашага боку мы выпучаем 25 БАЙЦОЎ З «БАТАЛЬЁНУ БАЯВЫХ УДАРНІКАЎ-ЭНТУЗІЯСТЫХ» і перадаем іх у распараджэньне Фрунзаўскага раёну партыі для аказаньня дапамогі ў прапрацоўцы сустрэчнага прамфінпляну на прадпрыемствах, якія адстаюць.

Мы выклікаем заводы «КАМУНАР», «ДРЭВААПРАЦОЎШЧЫК», ФУТРАВУЮ ФАБРЫКУ ІМЯ 1-ГА МАЯ І ДРУКАРНЮ ІМЯ СТАЛІНА закончыць прапрацоўку сустрэчных прамфінпляпаў НЕ ПАЗЬНЕЙ 20 ВЕРАСЬНЯ і ў сваю чаргу выклікаць іншыя прадпрыемствы.

НЯХАЙ ЖЫВЕ ЦК УсеКП(б)!

ЗА ПАШЫРЭНЬНЕ ФРОНТУ БАЯВОГА ЎДАРНІЦТВА!

ПЕРАТВОРЫМ ДЗЕНЬ 1-ГА КАСТРЫЧНІКА ВА ЎСЕСАЮЗНЫ ДЗЕНЬ АГЛЯДУ БАЯВЫХ СІЛ УДАРНІЦТВА І ЧЫСТКІ НАШЫХ РАДОЎ АД ІЛЖЭЎДАРНІКАЎ.

ГАНЬБА ДЭЗЭРТЫРАМ!

ДА ЎСІХ РАБОЧЫХ, РАБОТНІЦ, СЛУЖАЧЫХ І АДМІНІСТРАЦЫЙНА-ТЭХНІЧНАГА ПЭРСАНАЛУ ШВЭЙНАЙ ФАБРЫКІ „КАСТРЫЧНІК"

Мы, ініцыятыўная група рабочых-ударнікаў, азнаёмўшыся з адозвай ЦК УсеКП(б) і даведаўшыся, што ў нас на фабрыцы заўважаецца пэўная тэндэнцыя цякучасьці рабочае клясы сярод пасобнай часьці адсталых рабочых, сабраліся на нарадзе для абгаварэньня гэтых пытаньняў і рашылі: што ўход з сацыялістычнай фабрыкі ў той момант, калі рабочая кляса намагае ўсе свае сілы і энэргію на выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, у той момант, калі лепшыя і перадавыя ўдарнікі паказваюць сапраўдна гэраічныя прыклады барацьбы за бальшавіцкія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, — зьяўляецца нічым іншым, як дэзэртырствам з фронту сацыялістычнага будаўніцтва, які дзейнічае на руку клясаваму ворагу.

Мы лічым, што гэты ўход мае выразна рвацкі характар, які адбівае настроі адсталай часткі рабочае клясы.

Мы ганьбуем такіх лятуноў-дэзэртыраў і заклікаем усіх рабочых нашае фабрыкі даць рашучы, пралетарскі адпор такім настроям і дзеяньням. У сваю чаргу заяўляем, што мы абавязуемся не пакідаць фабрыку на працягу ўсяго тэрміну выкананьня пяцігодкі і заклікаем рабочых фабрыкі пасьледваць нашаму прыкладу.

Мы прапануем арганізаваць з ліку лепшых ударнікаў нашае фабрыкі «батальён баявых ударнікаў-энтузіястых», гатовых у кожную хвіліну дапамагчы савецкай уладзе і камуністычнай партыі перамагаць усе вузкія месцы ў нашым сацыялістычным будаўніцтве.

Уступаючы першымі добраахвотна ў батальён баявых ударнікаў-энтузіястых, мы бярэм на сябе абавязацельства ў першую чаргу абвясьціць барацьбу цякучасьці рабочае сілы на нашай фабрыцы і заклікаем лепшых ударнікаў узяць з нас прыклад.

Мы лічым, што атрымаць пачэсную назву баявога ўдарніка-энтузіястага, можа толькі той, хто не на словах, а на справе зьяўляецца лепшым ударнікам, хто не на словах, а на справе дае лепшую якасьць, ня робіць браку і прагуляў і зьяўляецца сапраўдным амагаром за справу сацыялістычнага будаўніцтва.

І так, наперад, на барацьбу за разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва!

Ганьба лятунам-прагульшчыкам, дэзэртырам з фронту сацыялістычнага будаўніцтва!

За бальшавіцкія тэмпы работы! Няхай жыве ЦК УсеКП(б) — баявы арганізатар рабочых мас! Няхай жыве рабочая кляса, аб'яднаная ў адзіную ўдарную брыгаду, для барацьбы за перамаганьне труднасьцяй сацыялістычнага будаўніцтва, за поўную перамогу камунізму!

Шусэр, Палойка, Баскіна, Штэрн, Крывашэй, Матлок, Перазоўскі, Разанаў, Крыгель, Капіроўская, Мукасей, Шульц, Рубінштэйн, Левін М., Менровіч, Гранэ, Самахвалаў, Бурштэйн, Пікус, Астрынскі, Піцельская, Аксельрод, Прудніка ва, Мішэль, Скурковіч, Лыж, Дворкін, Капляровіч, Палер, Бутылёў, Галавач, Бахоўцаў, Слабадзкой, Чарнаморэц, Грыф, Цырлін, Сьвярдлоў, Дот, Фердман, Сухаліцкі, Левін, Браўнін, Хэйман.



Вытворчая камуна заводу «Энэргія» ў складзе рабочых механічнага цэху: т.т. Урублеўскага, Лебедзева. Палічанскага, Шульмана і Голубева—ініцыятараў магутнага руху пралетараў БССР за абавязацельства—не пакідаць прадпрыемства да канца пяцігодкі.

154 абавязацельствы—
да канца пяцігодкі не пакідаць заводу

Учора, пасьля скончаньня работы першай зьмены, на заводзе «Дрэваапрацоўшчык» адбыўся мітынг, прысьвечаны адозвам ЦК УсеКП(б) і ЎсеЦСПС. З інфармацыяй выступіў тав. Клімаў, які заклікаў да 100-процантнага выкананьня прамфінпляну, да ўзмацненьня ўдарніцтва і сацспаборніцтва. З адказам выступіў рабочы-ўдарнік тав. Шарэйка, які зазначыў, што 154 РАБОЧЫХ ЗАВОДУ мабілізавалі сябе і далі абавязацельства да канца пяцігодкі не пакідаць заводу. Тав. Шарэйка заклікаў усіх рабочых нізатар рабочых мас! Няхай жыве рабочая кляса, аб'яднаная ў адзіную ўдарную брыгаду, для барацьбы за перамаганьне труднасьцяй сацыялістычнага будаўніцтва, за поўную перамогу камунізму!

Рабочыя прынялі наступную рэзалюцыю: «заўкому склікаць актыў ударнікаў заводу, прапрацаваць адозвы ЦК УсеКП(б) і ЎсеЦСПС, распрацаваўшы канкрэтныя мерапрыемствы па яе ажыцьцяўленьні. Узмацніць работу «сквозной» брыгады, уцягнуўшы туды больш рабочых-ударнікаў.

Рабочыя далі абяцаньне выканаць прамфінплян да пачатку трэцяга году пяцігодкі. Для палепшэньня забесьпячэньня рабочых заводу ў хуткім часе арганізаваць пры заводзе закрытыя разьмеркавальнікі і абутковую пачы-

Ня ў Глупаве, а... у Гомелі
Гомельскі акрвыканком забараніў абгаварэньне кантрольных лічбаў (?!)

Гэтымі днямі Гомельскі акрвыканком, заслухаўшы даклад прадстаўніка акрпляну Эпціна аб новых кантрольных лічбах, афіцыйнай пастановай прапанаваў усім прадпрыемствам устрымацца ад прапрацоўкі на рабочых сходах кантрольных лічбаў новага гаспадарчага году. У выніку—большасьць прадпрыемстваў Гомельшчыны, за выключэньнем заводу «Пралетары» і фабрыкі «Камінтэрн», не прапрацоўвалі кантрольных лічбаў і не арганізавалі сустрэчных прамфінпляпаў.

Два дні брыгадзір «Зьвязды» стараўся даведацца ад работнікаў акрвыканкому аб прычынах такой дзіўной пастановы, але работнікі акрвыканкому нічога пэўнага адказаць не маглі. «Ёсьць такая пастанова ЎсеЦСПС»—адказвалі некаторыя работнікі, але паказаць гэтую пастанову адмаўляліся з-за «адсутнасьці часу».

Цікава, што да гэтага часу пастанова акрвыканкому **нікім не адменена.**

Брыгадзір «Зьвязды» ЛЕВІН.

АД РЭДАКЦЫІ: Зьмяшчаючы гэтае паведамленьне наконт абураючай пастановы Гомельскага акрвыканкому, рэдакцыя патрабуе ад адпаведных органаў неадкладнага расьсьледваньня гэтае справы і прыцягненьня вінаватых да адказнасьці.

У БАРЫСАВЕ НЕ СЬПЯШАЮЦЦА

БАРЫСАЎ, 7. (Па тэлефону). Чатыры дні прашло, як апублікаваны адозвы ЦК УсеКП(б) і ЎсеЦСПС аб выкананьні прамфінпляпаў, але на прадпрыемствах Барысаву і Нова-Барысава, ЗА ВЫКЛЮЧЭНЬНЕМ «ЧЫРВОНАЙ БЯРЭЗІНЫ», да гэтага часу НІЧОГА НЯ ЗРОБЛЕНА, для таго, каб азнаёміць рабочых з адозвамі ЦК і ЎсеЦСПС.

На заводзе «КАМІНТЭРН» сакратар парткалектыву разводзіць рукамі, кажучы:

— Паказаньняў райкому няма. Ня ведаю, што рабіць, думаю ўключыць гэта пытаньне ў парадак дня чарговага бюро парткалектыву.

Трэба падкрэсьліць, што ў фанэрным цэху—вялікі прарыў у выкананьні праграмы і па заводзе—прарывы ў выкананьні якасных паказальнікаў. Набыла вялікія памеры цякучасьць рабочай сілы.

На фабрыцы «ПРАФІНТЭРН» нават ня зьбіраюцца прапрацоўваць адозву ЦК. Ні сакратара парт'ячэйкі, ні старшыні ФЗК на фабрыцы ўчора ня было. УСЕ ЯНЫ РАЗАМ карыстаюцца выхадным днём, у той час, як фабрыка працуе.

На фабрыцы «РАБОЧЫ» такі-ж малюнак.

На заводзе імя ДОМБАЛЯ толькі сёньня паставілі на пасяджэньні парткалектыву і будуць абмяркоўваць пытаньне аб адозьве ЦК. НА БАРЫСАЎСКІМ КАМБІНАЦЕ—поўная бязьдзейнасьць. Старшыня заўкому пераказваў кажа: «Пра такую адозву ня ведаю і ніякіх дырэктыў не атрымаў».

Вось малюнак, які характарызуе адносіны з боку партыйных і прафэсыянальных арганізацый барысаўскіх прадпрыемстваў да прапрацоўкі адозвы ЦК УсеКП(б).

Але больш за ўсіх паказаў прыклад поўнай бязьдзейнасьці БАРЫСАЎСКІ РК КП(б)Б. Да гэтага часу райком ня даў ніякіх паказаньняў ячэйкам. На запытаньне брыгады «Зьвязды», часова выконваючы абавязкі сакратара райкому т. ГАРБАТЫ даў такі адказ: «Усё зроблена, праведзена нарада трыкутнікаў, даны дырэктывы». Такую-жа інфармацыю ён даў адказнаму сакратару райкому, які толькі-што прыехаў з адпачынку. У сапраўднасьці-ж т. Гарбаты абмежаваўся толькі тым, што недрукаваў адносіну ўсім парткалектывам наступнага зьместу: «Прапрацоўку адозвы ЦК правесьці ў партгуртках, праз сходы, гутаркі па цэхах, зьменах, калгасах і ўстановах. На ўсіх сходах пры прапрацоўцы забясьпечыць поўнае партпіраўніцтва. Аб выніках паведаміць культпроп РК не пазьней 20-га верасьня. Заг. Культпропу ГАРБАТЫ».

Але самае цікавае тое, што АДНОСІНА ДА ГЭТАГА ЧАСУ ЗНАХОДЗІЦЦА Ў СТАЛЕ АГУЛЬНАЙ КАНЦЫЛЯРЫІ РАЙКОМУ і ні адзін парткалектыў не атрымаў паказаньняў ад РК.

Аб агідна марудных адносінах барысаўскага РК да прапрацоўкі адозвы ЦК сьведчыць яшчэ той факт, што ў парадак дня чарговага бюро РК, якое адбудзецца 8-га верасьня, гэта пытаньне НЯ ЎКЛЮЧАНА.

Брыгада «Зьвязды»
ФАЛЬКО, КАВАЛЕЎ.

Міжнародны юнацкі дзень за рубяжом

ДЭМАНСТРАЦЫІ РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ МОЛАДЗІ Ў ВІЛЬНІ

ВІЛЬНЯ. — Як падае буржуазны друк, 4-га верасьня ў Вільні, у зьвязку з XVI МЮД'ам, адбыліся значныя дэманстрацыі рэвалюцыйнай моладзі. Пасьля скончаньня работ на фабрыках і заводах, групы моладзі пачалі зьбірацца на Нямецкай і Яўрэйскай вуліцах, і разгарнуўшы чырвоныя сьцягі, наладзілі дэманстрацыі. Пры зьлёце гэтых двох вуліц абедзьве групы дэманстрантаў злучыліся. Адзін з удзельнікаў дэманстрацыі выступіў з прамоваю. У гэты момант шмат было раскідана камуністычных адозваў, а таксама быў вывешаны на тэлефонных дротах чырвоны сьцяг.

Дэманстрацыю разагнаў моцны атрад паліцыі, якая двух чалавек арыштавала.

Апрача Нямецкай і Яўрэйскай вулиц, выступленьні рэвалюцыйнай моладзі адбыліся і ў іншых часьцях гораду.

МАСАВЫЯ АРЫШТЫ РАБОЧАЙ МОЛАДЗІ Ў БУДАПЭШЦЕ

ВЕНА, 6. Як паведамляюць з Будапэшту, у сувязі з прыпачатай на сёньня дэманстрацыяй вэнгерскага саюзу камуністычнай моладзі, ахранка зрабіла ўчора ў Будапэшце і правінцыяльных гарадох масавыя арышты рэвалюцыйных рабочых. У Будапэшце і ваколіцах арыштаваны 53 чал. У мястэчку, паблізу Будапэшта, пры арышце аднаго камуніста, паліцэйскіх акружыў вялікі натоўп работніц, якія з крыкамі абурэньня і пагрозамі прабавалі аслабаніць арыштаванага. Арыштаванаму ўдалося ўцячы. Паліцэйскія арыштавалі адну работніцу. Паліцэйскія атрады атрымалі распараджэньне пры найменшым супраціўленьні адкрыць агонь бяз усякага папярэджаньня. У горадзе панае вельмі напружаны настрой.

(ТАСС).

КАМУНІСТЫЧНЫЯ ЛІСТОЎКІ Ў ЯСАХ

ВЕНА, 6. Як падаюць з Бухарэсту, у Ясах (Румынія), у сувязі з XVI МЮД-ам распаўсюджана вялікая колькасьць нелегальных камуністычных лістовак. У сувязі з выкрыцьцём лістовак ахранка зрабіла шматлікія вобыскі і арышты.

(ТАСС).

ЖАБРАЦКІ ЗАРОБАК МАЛАДЫХ РАБОЧЫХ І СЯЛЯН У КАЛЁНІЯХ

ПАРЫЖ, 6. У сувязі з XVI МЮД'ам «Юманітэ» спыняе ўвагу чытачоў на жудасна цяжкім становішчы маладых маладога рабочага хістаецца ў Інда-Кітаі ад 1½ да 3 франкаў у дзень (ад 11 да 22 кап.). У паасобных галінах прамысловасьці зарплата ма[illegible]х рабочых не перавышае 1 франку (каля 8 кап.) у дзень. Сямігадовыя дзеці ў калёніях вымушаны працаваць па 10 гадзін у дзень, прыходзячы на работу галодным. У вугальных капальнях тысячы дзяцей, каб зьвесьці канцы з канцамі ў жабрацкім бюджэце сваіх сем'яў, прымушаны па 10 гадзін у дзень ганяць ваганэткі з вугальпем.

«Юманітэ» зварачаецца да маладых рабочых і сялян Францыі з заклікам: «У дзень, калі вас у салдаты, або матроскай форме французкі імпэрыялізм пашле для барацьбы супроць наўстаўшых калёніяльных братоў, мы павінны аб'яднацца ў рэвалюцыйным выступленьні з прапоўнымі калёніямі».

АРЫШТ тав. НЭЙМАНА

**БЭРЛІН, 6 верасьня раніцою ў Бохуме паліцыя разагнала рабочы сход

Да ліквідацыі акруг

Пад шырокі грамадзкі кантроль—

выкананьне дырэктыў партыі аб узмацненьні раёнаў

Накіроўваюцца на работу ў раён

Надаючы вялікае значэньне справе УСТАНАЎЛЕНЬНЯ ГРАМАДЗКАГА КАНТРОЛЮ НАД ВЫКАНАНЬНЕМ ДЫРЭКТЫЎ ПАРТЫІ АБ УЗМАЦНЕНЬНІ РАЁНАЎ акруговымі работнікамі, «Зьвязда» згодна пастановы бюро ЦК КП(б)Б ніжэй зьмяшчае сьпіс таварышоў з АКРУГОВЫХ «ДВАЦЦАТАК», якія накіроўваюцца НА РАБОТУ Ў РАЁН.

Райкомы павінны неадкладна паведаміць ЦК КП(б)Б і рэдакцыю «ЗЬВЯЗДЫ» аб свае часовым прыезьдзе на работу, а таксама прозьвішчы тых, якія не зьявіліся на месца сваёй работы.

Па б. Менскай акрузе:

ДАМБРОЎСКІ — на партыйную работу, КІШ — нарсуд, ЗЫСМАН — пракурор ЗАСЛАЎСКАГА раёну, КАРАНЕЎСКІ — савецкая работа ў СЬМІЛАВІЦКІМ раёне, ГРАВІТ — савецкая работа ў КОЙДАНАЎСКІМ раёне, ЦІСЭНБАЎМ — работа па ахове здароўя, БЯГУН — райкалгассаюз, КУДЗЕЛІК—кооперацыйная работа ў ГРЭСКІМ р., ІВАНОЎ — Калгассаюз у СЬМІЛАВІЦКІМ р., БОБІХАЎ — кооперацыйная работа ў ЛАГОЙСКІМ р., ВАЙЦЭХОЎСКІ — у БЯРЭЗІНСКІМ р., ЗІНКЕВІЧ — інспэктар нарасьветы.

Па б. Віцебскай акрузе:

АРАШЧУК — партыйная работа ў ЛЕЗЬНЯНСКІМ р., МУНДАЎ — партыйная работа, ВАЛОДЗЬКА — савецкая работа, ТУМАНАЎ — партработа ў БЕШАНКОВІЦКІМ р., ПАЙКІН — пляновая работа ў ВЫСАЧАНСКІМ р., ГОРШТЭЙН — прафработа, ЦЫНІД — нарсудзьдзя ў ЧАШНІЦКІМ р., ПІНКІС — прафработа ў СІРОЦІНСКІМ р., САПРЫЦКІ—савецкая работа ў СІРОЦІНСКІМ р., САРАКАЛЁТАЎ—прафработа ў СЕННЕНСКІМ р., САБЕЛІН—інспэктар нарасьветы ў ЧАШНІЦКІМ р., ГОЛЬФАНД — інспэктар аховы здароўя ў ВЫСАЧАНСКІ р., НАРАЗЗНКА — дырэктар зоатэхнічнага інстытуту ў ГОРКАХ, СЯРЭБРАНЬНІКАЎ — Папяводсаюз у СУРАЖСКІМ р., СОКАЛАЎ — калгассаюз у ВЫСАЧАНСКІМ р., ЦЬВЯТКОЎ — кооперацыйная работа, НІКОЛЬСКІ — Райбанк, ГАРАДОК.

Па Магілеўскай акрузе:

ВАЛКОВІЧ — партыйная работа ў КЛІМАВІЦКІМ р., ШОЛАМАЎ — партыйная работа ў КРЫЧАЎСКІМ р., МАЛАШОНАК — савецкая работа, ТАРАСАЎ — савецкая работа ў КРЫЧАЎСКІМ р., ЛЯШЧЫНСКІ — прафработа, ДУПЛЯЧОЎ — пракурор ШКЛОЎСКАГА РАЁНУ, МІНЧОНАК — савецкая работа ў ШКЛОЎСКІМ раёне, ЛОЦМАНАЎ — савецкая работа ў КЛІМАВІЦКІМ раёне, ТУЛЬМАН — Райгандаль, КАСЬЦЯНЕВІЧ — інспэктар народнай асьветы ў БЫХАЎСКІМ р., ВАЛЬФСОН — інспэктар аховы здароўя ў БЫХАЎСКІМ р., СОСКІН — Райкалгассаюз, ЛАБАНАЎ — кооперацыйная работа ў БЫХАЎСКІМ р., ЛАГЕРАЎ — партыйная работа ў КАРМЯНСКІМ р., ІВАНОЎ — кооперацыйная работа, ЕЛЯНЕЎСКІ — ПРАПОЙСКІ р., РАСКІН — ЧАВУСКІ р.

Па Мазырскай акрузе:

СУДАКОЎ — партыйная работа ў КАЛІНКАВІЦКІМ р., НОВІКАЎ — партыйная работа ў ПЯТРЫКОЎСКІМ р., ЛЯХАЎ — партработа ў КАПАТКЕВІЦКІМ р., КУДЗЕЛЬКА — партработа ў КАЛІНКАВІЦКІМ р., ШАПІРА — савецкая работа, ЛЕЎЧЭНКА — пракурор КАРАЛІНСКАГА р., ШАПАРЫСАЎ — пракурор ЖЫТКАВІЦКАГА р., ГРАД — савецкая работа, МАКАРЭВІЧ — Райгандаль ў ПЯТРЫКОЎСКІМ р., СТРЭЛЬЧАНКА — інспэктар нарасьветы ў ТУРАЎСКІМ р., ХАРЛАЙ — работа па ахове здароўя ў ПЯТРЫКОЎСКІМ р., КОНАНАЎ — Калгассаюз у КАМАРЫНСКІМ р., ФРЫДЛЯНД — Папяводсаюз у ТУРАЎСКІМ р., ЗЫБКО — упоўнаважаны МТС у ЖЫТКАВІЦКІМ р., ВЫСАЧАНСКІ — кооперацыйная работа ў КАЛІНКАВІЦКІМ р., ШАФРАН — ПЯТРЫКОЎСКІ р.

Па Полацкай акрузе:

ФЕДАРАЎ — партработа ў ДРЫСЕНСКІМ р., ПАКАПЕНЬ — партработа ў БАРКАВІЦКІМ р., МАТУС — савецкая работа ў ВЕТРЫНСКІМ р., ПІЛІПЁНАК — прафработа, МЕЕРЗОН — партработа ў АСЬВЕЙСКІМ р., ГЛЕЗАРАЎ — у ДРЫСЕНСКІМ раёне, СЬЦЯПАНАЎ — савецкая работа, ПАПЛАЎСКІ — Райгандаль, СЛУЦАК, МЕЛЯШКЕВІЧ —інспэктар нарасьветы ў ДРЫСЕНСКІМ р., ЭНЦІН — заг. больніцай, ЯНДУЛЬСКІ — упоўнаважаны МТС у АСЬВЕЙСКІМ р., СТРУЦІНСКІ — кооперацыйная работа, ДАНЮШКІН — райкалгассаюз, ВАЙСБЭРГ — кооперацыйная работа, ФЭЙГІН — заг. кант. Дзяржбанку.

Па б. Аршанскай акрузе:

БУТЭР — партработа ў ГОРАЦКІМ р., АЛЕЙНІКАЎ — савецкая работа, КОХАН — пазавая работа ў раёне, БУРАКОЎ — райпракурор, КУДЗЕЛЬСКІ — райпракурор, РАТАЙКА — савецкая работа ў ЛЯДНЯНСКІМ р., РОЗІН — інспэктар нарасьветы ў ЧАРЭЙСКІМ р., КНІГА — заг. больніцаю ў ЗАСЛАЎСКІМ р., МАЖЭЙКА — Райкалгассаюз, ШАБАЛТАС — савецкая работа ў ГОРАЦКІМ р., ВАРАБЁЙ — кооперацыйная работа, СЬЦЕПАНЮК, ЮШКЕВІЧ.

Па Гомельскай акрузе:

ЛЕВІН — партработа ў РЭЧЫЦКІМ р., ЗЕЛЕНКОЎСКІ — партработа ў БРАГІНСКІМ р., ЭЛЬКІНД — савецкая работа ў ЛОЕЎСКІМ р., СМАЛЬ — пракурор ЛОЕЎСКАГА р., ЛІПСКІ — пракурор ВЕТКАЎСКАГА р., МАЦКЕВІЧ — савецкая работа ў РЭЧЫЦКІМ р., ГАРЭЛІК — райгандаль, ХОЙНІКІ, МАЦЬКО — савецкая работа ў ГОМЕЛЬСКІМ вясковым р., ЯНЧЭНКА — інспэктар аховы здароўя ў БУДА-КАШАЛЕЎСКІМ р., ДРАЙЧУК — Райкалгассаюз, БРАГІНА, РЫЎКІН — Райкалгассаюз, САВОСАЎ — кооперацыйная работа ў КАМАРЫНСКІМ р., АНДРОСЕНКА — кооперацыйная работа ў БРАГІНСКІМ р., НАРТЫШ-БЛУК — у ВЕТКАЎСКІМ раёне.

Па Бабруйскай акрузе:

БАГДАНАЎ — партработа ў СЛУЦКІМ р., ЗГЛЕ — партработа, НАХІЛЬНІЦКІ — савецкая работа, ДАРЭЎСКІ — пляновая работа, КАТЛЯРСКІ —пракурор СЛУЦКАГА р., ГРЫШЧАНКА — савецкая работа ў СТАРОБІНСКІМ р., ЯНАНІС — райпракурор, КАМЧАКОЎ — райгандаль ЖЛОБІНА, ПАКРОЎСКІ — інспэктар нарасьветы ў СЛУЦКІМ р., КАЧУК — райкалгассаюз, КАВАЛЕНКА — папяводсаюз у СЬВІСЛАЦКІМ р., ФАРБЭРАЎ — Калгассаюз у СЬВІСЛАЦКІМ р., НАЙДУК — кооперацыйная работа ў СЛУЦКІМ р., ШАКАЛАЎ і МІХЛІН.

Пытаньні сувязі і інфармацыі пасьля ліквідацыі акруговага зьвяна

(У парадку абгаварэньня)

Ліквідацыя акруговых прафсаюзных зьвеньняў адкрывае новы этап таксама ў прафсаюзнай рабоце. Аднак, практычнае ажыцьцяўленьне гэтай рэформы і яе посьпех будзе залежыць, галоўным чынам, ад мэтадаў і форм сувязі і узаемнай інфармацыі паміж прафсаюзнымі арганізацыямі.

З ліквідацыяй акруговага зьвяна «нагрузка» на ЦСПСБ і ЦК саюзаў будзе складаць каля 100 раёнаў. Неадкладна трэба прыступацца над пытаньнямі мэтаду і форм сувязі паміж цэнтрам і шырокай перыферыяй.

Для дапамогі раёнам у вырашэньні практычных задач па сацыялістычнай перабудове вёскі і пагыбленьні культурнай рэвалюцыі — **старыя формы сувязі і інфармацыі абсалютна ня могуць быць ужыты і канчаткова сябе зжылі.**

Цэнтральныя інфармацыйныя апараты саюзаў павінны будуць улічваць, вывучаць і асьвятляць стан работы пізавых прафарганізацый на асобных галінах. Для гэтага неабходна адразу-жа ўстанавіць асноўныя формы, галоўным чынам **жывой сувязі праз інструктарскі апарат**, а таксама ўстанавіць **мэтады інфармацыі па адзінаму максымальнага скарачэньня пісьмовай справаздачнасьці.**

Ніводзін шмат раёнаў, якія знаходзяцца далёка ад рэспубліканскага цэнтру, у вельмі цяжкіх умовах транспарту. Становішча сувязі было неадвальнаючым нават пры наяўнасьці акруг. Новая рэформа патрабуе самых радыкальных і хуткіх мер па наладжаньні тых форм сувязі, якія зьяўляюцца найбольш зручнымі ва ўмовах дапата раёну.

У гэтых раёнах выключнае значэньне набывае сувязь па эфіры — **радыёсувязь.** Кожны райпрафсаюз павінен быць забясьпечаны добрым радыё-прыёмнікам і ў пэўныя гадзіны ён павінен даяжурыць для прыёму дырэктыў і узаемнай інфармацыі. Неабходна, каб ЦСПСБ неадкладна прыступіў да арганізацыі праз менскі цэрадатчык **«Гадзіны прафсаюзнай сувязі і інфармацыі».** Са складу членаў райпрафсаветаў неабходна вылучыць **таварыша, які-б адказваў за сувязь і інфармацыю і які** павінен будзе трымаць пастаянную інфармацыйную сувязь з ЦСПСБ. Адказы, тлумачэньні па найбольш важных пытаньнях таму ці іншаму райпрафсаюзу неабходна даваць не ў індывідуальным парадку, а ў голас — праз радыё, каб усе маглі карыстацца вопытам кожнага.

Пры сучасных тэмпах жыцьця трэба перадаваць і дырэктывы праз радыё, ня спыняючыся перад «неудобствами» дачы дырэктывы бяз «выходзячага нумару і без расьпіскі ў атрыманьні».

Галоўнае значэньне мае таксама пытаньне **аб друку.** Ліквідацыя акруг патрабуе максымальнага ўзмацненьня друку, як аднаго з самых магутных вагароў кіраўніцтва, інфармацыі, самакрытыкі і змаганьня за ўдарныя тэмпы работы. Прафдруку ў нас, на жаль, амаль ня існуе. Дадатак да **«Зьвязды». «Прафрух»,** які выходзіць раз на тыдзень, ня мае да гэтага часу пэўнай установі, на што і на каго ён разьлічаны, і не адказвае тым патрабаваньням, якія зараз будуць прад'яўлены друку. Неабходна зараз-жа ўрэгуляваць пытаньне аб прафдруку.

Х.

ДЭЗЭРТЫРЫ

Аршанскі акругком пастанавіў. Сьпіс работнікаў пасланы ў раён. У якасьці адказных работнікаў партыйных, савецкіх і кооперацыйных установ у **Круглянскі** раён (Аршаншчына) павінны былі паехаць пастуныя таварышы:

Граблеўскі,
Масьлікаў,
Галецкі,
Ягусман.

Прайшоў ужо доўгі час пасьля гэтай пастановы. Вызначаныя таварышы яшчэ дагэтуль у раён не зьявіліся.

Ар.

Раён сумуе па работніках

Прайшло два тыдні. Акруга ліквідавана. АЛЕ І НА СЁНЕШНІ ДЗЕНЬ ні адзін чалавек з тых, якія павінны былі ўзмацніць ЛАГОЙСКІ РАЁН (б. Менская акруга), не паказваецца. Раён з надзеяй чакае.

А становішча з работнікамі ў ЛАГОЙСКІМ раёне надзвычай дрэннае. У райкоме працуе толькі адзін сакратар. У райвыканкоме — толькі старшыня РВК і загадчык зямельнай часткі. Паводле апошняй пастановы ЦК УсеКП(б), Райкалгаспсаюз і Папяводсаюз павінны быць рэарганізаваны. Застаюцца існаваць толькі дзьве арганізацыі — райкалгаспсаюз і калгассаюз. А якое-ж становішча мы маем? Замест 35 чал., якія павінны быць у гэтых 4-х арганізацыях, ёсьць усяго 5.

Бязумоўна, што ўсё гэта адбіваецца на ходзе ўсіх важнейшых кампаній, якія партыя праводзіць на вёсцы.

Раён чакае неадкладных мер у адносінах да дэзэртыраў, якія ўхіляюцца ад паездкі ў раён.

Н.

Падрыхтуем новыя пралетарскія кадры работнікаў друку

Пастанова

сакратарыяту ЦК КП(б)Б

Заслухаўшы паведамленьне сэкстару друку культпропу ЦК КП(б)Б, сакратарыят адзначае нядбайныя адносіны большасьці раённых партыйных камітэтаў і рэдакцый цэнтральных і акруговых газэт да справы камплектаваньня газэтнага аддзяленьня Камвузу, у выніку чаго камплектаваньне гэтага аддзяленьня праходзіць нездавальняюча.

Надаючы важнае палітычнае значэньне справе своечасовага камплектаваньня газэтнага аддзяленьня Камвузу, якое павінна забясьпечыць належнымі кадрамі сетку раённых газэт, сакратарыят ЦК КП(б)Б **ухваляе:**

1. Абавязаць усе раённыя камітэты партыі на працягу 2-х дзкад правесьці мабілізацыю адпаведнай колькасьці партыйцаў, згодна прыкладзенай раскладкі Культропу ЦК. Пасьля сканчэньня гаэтнага аддзяленьня курсанты будуць накіроўвацца ў першую чаргу на работу ў раённыя газэты.

2. Абавязаць рэдакцыі цэнтральных і акруговых газэт у 2-х-дзкадны тэрмін правесьці вярбоўку на газэтныя аддзяленьні дзённага і вячэрняга Камвузаў, выходзячы з арыентовачнай раскладкі, якая вызначана для кожнай рэдакцыі Культпропам ЦК КП(б)Б.

3. Заняткі на газэтным аддзяленьні распачаць не пазьней 20-га кастрычніка г. г.

4. Для кіраўніцтва справай камплектаваньня газэтнага аддзяленьня Камвузу стварыць тройку ў складзе т. т.: Савічэ (Камвуз), Курцін (сэктар друку Культпропу ЦК) і Розман (ЦП Друкароў).

Усім райкомам КП(б)Б, рэдакцыям цэнтральных і акруговых газэт, рэдакцыям часопісаў, фракцыі прафсаюзу друкароў

Сакратарыят ЦК КП(б)Б у спэцыяльнай пастанове, якая надрукавана ў газэце «Зьвязда», падкрэсьліў палітычную важнасьць уважлівага і своечасовага камплектаваньня газэтных курсаў дзённага і вячэрняга Камвузаў.

Згодна пастановы, Сакратарыятам ЦК, Сэктарам Друку Культпропа ЦК КП(б)Б выпрацавана наступная раскладка, арыентуючыся якой Райкомы КП(б)Б павінны ў **двухдзённы тэрмін** правесьці адбор партыйцаў, які-б адпавядалі прыкладзеным пры гэтым умовам прыёму на газэтныя курсы.

Раскладка Райкомаў КП(б)Б наступная:

Лепельскі РК КП(б)Б — 1, Асьвейскі —1, Дрысенскі — 1, Гарадоцкі — 1, Высачаны — 1, Сенна — 1, Ворша — 1, Дуброўна — 1, Горкі — 1, Барысаў —2, Койданава — 1, Слуцак — 1, Рагачоў — 1, Шклоў — 2, Клімавічы — 1, Прапойск — 1, Рэчыца — 2, Мазыр—1, Гомель — 3, Віцебск — 3, Полацак—2, Магілеў — 2, Бабруйск — 2, Хойнікі —1, Лоеў — 1, Камарына — 1, Чэрэйск — 1, Тураў — 1, Чавусы — 1, Жыткавічы — 1, Чырвоная Слабада—1. Рэдакцыям цэнтральных і акруговых газэт таксама ў двухдзкадны тэрмін правесьці набор на газэтныя аддзяленьні дзённага і вячэрняга Камвузаў з асяродзьдзя рабкораў, удзельнікаў фабрычна - заводзкіх друкаваных і насьценных газэт. Арыентовачная раскладка для рэдакцый газэт наступная:

Рэдакцыя газэты «Зьвязда»—7, газэта «Рабочий» — 7. «Акцябр» — 7, «Чырвоная Зьмена» — 5, «Савецкая Беларусь» —3, «Беларуская Вёска» — 5, «Сел.-Гасп. Рабочы Беларусі—7, «Юнгер Арбэтэр» — 1, «Орка» — 1, Літоўская газэта — 1, «Работніца і Сялянка» — 1, «Віцебскі Пралетары» — 3, «Палеская Праўда» — 3.

На газэтнае аддзяленьне **Вячэрняга** Камвузу раённыя камітэты партыі гор. Менску і рэдакцыі цэнтральных газэт павінны арыентовачна завербаваць наступную колькасьць слухачоў:

Фрунзаўскі РК КП(б)Б — 10, Кастрычніцкі РК КП(б)Б — 15, «Зьвязда» —10. «Рабочий» — 20, «Савецкая Беларусь» — 5, «Акцябр» — 15, «Чырвоная Зьмена» — 15, «Раб. і Сялянка» —5, «Юнгер Арбэтэр» — 3, «Орка»—3, Літоўская газэта — 3.

Кандыдатуры, якія высоўваюцца РК КП(б)Б для накіраваньня на газэтныя курсы Камвузу, павінны быць зацьверджаны бюро РК КП(б)Б.

Сьпіс рабкораў, якія вызначаюцца рэдакцыямі газэт для залічэньня на курсы непасрэдна накіроўваюцца рэдакцыямі газэт у Камвуз.

Анкеты і сьпісы характарыстыкі кандыдатаў для залічэньня на газэтныя курсы павінны тэрмінова быць накіраваны ў Камвуз (гор. Менск, Універсытэцкая, 27) з адзнакай на канвэрце «На газэтныя курсы».

Культпроп ЦК КП(б)Б зварачае ўвагу раённых камітэтаў партыі і рэдакцыі газэт на палітычную важнасьць своечасовага і ўважлівага выкананьня дырэктывы ЦК КП(б)Б аб укамплектаваньні газэтных курсаў Камвузу.

Вынік камплектаваньня газэтнага аддзяленьня Камвузу і ўдзел у камплектаваньні РК КП(б)Б і рэдакцый газэт будуць спэцыяльна праверены Культпропам ЦК КП(б)Б.

Аб наборы на газэтныя аддзяленьні дзённага і вячэрняга Камвузу трэба давесьці да ведама самай шырокай масы партыйцаў і рабкораў.

Намесьнік загадчыка Культпропам ЦК КП(б)Б О. КАНАКОЦІН.
Рэктар Камвузу імя Леніна САЕВІЧ.

Правілы прыёму на курсы работнікаў друку пры Камвузе Беларусі імя „Леніна"

1. Курсы работнікаў друку зьяўляюцца ўстановай Камвузу, якая ставіць сваёй мэтай падрыхтоўку кваліфікаваных работнікаў друку для рэдакцый цэнтральных, раённых, калгасных і фабрычна-заводзкіх газэт БССР.

2. Тэрмін навучаньня на курсах 2 гады.

3. На курсы прымаюцца члены КП(б)Б, якія адпавядаюць наступным запатрабаваньням:

а) Вытворчы стаж у прамысловасьці ці сельскай гаспадарцы ня менш 3-х год.

б) Партыйны стаж ня менш 2-х год (без замены стажам ЛКСМВ).

в) Вошыт партыйна-масавай работы.

г) Узрост ад 22 да 34 год.

Увага: Пры ўсіх гэтых умовах перавага даецца чырвонаармейцам, удзельнікам грамадзянскай вайны і г. д., якія маюць стаж актыўнай партыйнай і грамадзкай работы.

4. Паступаючыя на курсы павінны быць добра пісьменнымі, умець выкладаць свае думкі для друку ў пісьмовай форме, арыентаваца ў бягучых палітычных пытаньнях і ўладаць асноўнымі ведамі па гісторыі УсеКП(б) і палітэканоміі.

Увага: Пажадана, апрача гэтага, каб таварышы, якія паступаюць на газэтнае аддзяленьне прадставілі свае работы зьмешчаныя ў друку за апошні год.

5. Асобы з заразьлівымі хваробамі, пэўрастэніяй у запяжнай форме, сухотамі і наогул фізычна слабыя на курсы работнікаў друку—ня прымаюцца.

Увага: Інвалідзнасьць сама па сабе ня можа служыць перашкодай для паступленьня на курсы.

6. З мэтай папярэдняй праверкі жадаючых паступіць на курсы работнікаў друку, пры Культпропе РК КП(б)Б стварацца адборачныя камісіі. Пры гэтых-жа камісіях утвараецца і мэтадычны аддзел тых, хто камандыруецца.

7. Усе адабраныя кандыдаты павінны абавязкова ўласнаручна запоўніць асабовую картку, якая рассылаецца і напісаць свой кароткі жыцьцяпіс. Сьпісы намечаных РК КП(б)Б і рэдакцыямі цэнтральных газэт да камандыраваньня высылаюць у Камунэнівэрсытэт з наступнымі дакумэнтамі на кожнага камандыраванага: 1) асабовую картку, засьведчаную адборачнай камісіяй, 2) жыцьцяпіс, 3) даведку аб стане здароўя, 4) водзыў аб апошняй грамадзка-партыйнай рабоце, 5) расьпіску ў тым, што ўмовы прыёму яму вядомы.

8. Усім дапушчаным адборачнай камісіяй пры раёнах да прыймовых выпрабаваньняў даецца водпуск для падрыхтоўкі з захаваньнем двухмесячнай пэнсіі на тэй установе ці прадпрыемству, дзе яны працавалі.

9. На курсах слухачы, як студэнты Камвузу, забясьпечваюцца на вызначаных нормах інтэрнатам, стыпэндыяй, харчаваньнем, пасьцельнай бялізнай, абмундыраваньнем, падручнікамі і пісьмовымі прыладамі.

Камвуз не бярэ на сябе ніякіх абавязацельстваў па забесьпячэньні кватэрамі сем'яў слухачоў.

10. Арганізацыі, якія камандыруюць павінны:

а) прыняць на свой рахунак дарожныя выдаткі камандыраваных (аплата праезду абавязкова ў абодны канцы).

б) Прыняць на сябе клопаты аб сям'і студэнта, якая застаецца на месцы.

11. Камандыраваныя павінны: а) мець з сабой бялізну, абутак, верхнюю вопратку на першы год навучаньня і б) павінны прадставіць:

1. Камандыровачнае пасьведчаньне;

2. Асабовую справу, або вучотна-партыйную картку;

3. Вучотна-пайсковы білет, або другі дакумант, які-б сьведчыў аб адносінах да вайсковага вучоту.

12. Прыймовыя выпрабаваньні будуць праводзіцца ў Камунэнівэрсытэце (Універсытэцкая, 27) з 15-га кастрычніка 1930 г.

13. Ня вытрымаўшыя выпрабаваньня ці не падыходзячыя пад умовы прыёму па стане здароўя, або той, хто не прадставіў дакумантаў—будуць варочацца назад на месца ранейшай работы, якая захоўваецца за паступаючымі да канчатковага высьвятленьня аб іх паступленьні на курсы.

14. Таварышы, якія знаходзяцца на адказнай партыйнай рабоце і здавальняюць усім запатрабаваньням прыёму і па тых ці іншых прычынах не паталі ў лік разьвёрсткі райкомаў, могуць падаваць заявы непасрэдна на курсы, прыкладаючы ўсе патрэбныя паводле правіл прыёму дакуманты.

15. Заняткі на курсах пачынаюцца 20-га кастрычніка 1930 году.

Загад. культпропу ЦК КП(б)Б А. СЯНЬКЕВІЧ.
Рэктар Камвузу Беларусі імя Леніна САЕВІЧ.

ПРАЗ 6 ДЗЕН—ЗЬЕЗД ПА ПАЛІТЭХНІЗАЦЫІ ШКОЛЫ

РЫХТАВАЦЦА ПА-УДАРНАМУ!

МЕНСКІЯ ЧЫГУНАЧНІКІ І РАБОЧЫЯ ЗАВОДУ „ЭНЭРГІЯ" УЗЯЛІ ШЭФСТВА НАД ШКОЛАМІ, ПАБУДАВАЛІ МАЙСТЭРНІ ДЛЯ ШКОЛ

Пачын менскіх рабочых павінны падхапіць усе заводы і фабрыкі Беларусі!

Твар палітэхнізаванай школы

ЗАВОД — ШЭФ ШКОЛЫ, ШКОЛА — ЦЭХ ЗАВОДУ

Барацьба за індустрыялізацыю краіны, за сацыялістычную перабудову вёскі знаходзіць жывейшы водгук сярод кі знаходзіць жывейшы водгук сярод падрастаючай вымены — 2-й фабрычна-заводзкай школы імя 10-годзьдзя БССР.

Пытаньне палітэхнізацыі школай усьвядомлена і школа мае некаторы вопыт. Школа цесна зьвязана з заводам **«Энэргія». Завод шэфствуе над школай.** Вытворчая праца адбываецца ў вучобна-вытворчай майстэрні заводу. Вучні 6-й, 7-й і 8-й клясы працуюць у майстэрні па 16 гадзін у месяц. Цяпер лік гадзін значна павялічваецца. У заводзе ўсе вучні вывучаюць як апкай майстэрні вучні вывучаюць як апкай майстэрні вучні вывучаюць як апкай майстэрні

НАША ЗАПЫТАНЬНЕ БЕЛСЕЛЬСНАБУ

ці могуць малатарні працаваць без прывадоў?

Зачынілі дзьверы перад беднякамі падкулачнікі з калгасу „Полымя". У Сенненскім раёне сяўбе пагражае зрыў.

УПАЎНАВАЖАНЫМ ПАСЕЎКАМПАНІІ РВК

Сяўба разгарнулася. Ёсьць выпадкі непадрыхтаванасьці зямлі пад сяўбу. Саўгасы і калгасы ня ідуць наперадзе. Становішча насенных фондаў не забясьпечвае сваячасовага пасеву ачышчаным насеньнем. Абавязваю неадкладна забясьпечыць сваячасовасьць сяўбы ў саўгасах і калгасах. Апошнія павінны ўзяць на буксір індывідуальны сэктар, аказваючы яму належную дапамогу.

РАЧЫЦКІ.

Правільным разьмеркаваньнем ураджаю і сваячасовым выкананьнем пляну асеньняй сяўбы замацуем калгасы, выклічам новы калгасны прыліў.

ВЫПРАВІЦЬ

Якія памылкі дапусьцілі калгасы „Расьсьвет—Пераможца", „Беларуская вёска" і „Новы шлях" пры разьмеркаваньні ўраджаю?

Правільнае разьмеркаваньне ўраджаю і прыбыткаў у калгасах зьяўляецца матутным вагаром далейшага разьвіцьця калектывізацыі. У тых раёнах, дзе шырока абмеркаваны парадак разьмеркаваньня ўраджаю і прыбыткаў у калгасах, дзе на канкрэтных прыкладах паказана перавага калектыўнае працы над індывідуальнай,—там назіраецца новы калгасны прыліў, там адзіноасобнікі ідуць у калгасы. Аднак, дзяржаўныя партыі і ўраду аб разьмеркаваньні ўраджаю яшчэ прапрацаваны далёка не ва ўсіх раёнах. У шмат якіх раёнах паказаньні партыі і ўраду па пытаньнях разьмеркаваньня ўраджаю не папулярызаваны і не даведзены да калгаснікаў.

Замест таго, каб разгарнуць вакол гэтага пытаньня шырокую гаспадарча-палітычную кампанію, уцягнуць у яе ўсіх калгаснікаў і адзіноасобнікаў, паказаць на фактах і лічбах перавагу калектыўнае гаспадаркі і арганізаваць новы прыліў у калгасы, у некаторых раёнах мясцовыя работнікі прабуюць вырашыць гэта пытаньне габінэтным парадкам, ажыцьцяўляючы кіраўніцтва пры дапамозе бюракратычных цыркуляраў. У асаблівасьці адчуваецца слабы і неадвальняючы ўдзел агранамі, якая у першую чаргу павінна аказаць калгасам дапамогу ў разьмеркаваньні ўраджаю і прыбыткаў.

У выніку такой работы цэлы рад калгасаў пры разьмеркаваньні ўраджаю дапусьцілі грубыя памылкі. Напрыклад, калгас «Расьвет — Пераможца», Жлобінскага раёну (свой праект разьмеркаваньня ўраджаю і прыбыткаў калгас зьмясьціў у «Зьвязьдзе» ад 25-жніўня) адлічыў 5 проц. на абагуленую маемасьць з умоўна чыстага даходу. Гэты-ж калгас устанавіў спажывецкія нормы для членаў арцелі. Асноўная памылка калгасу «Расьсьвет—Пераможца» заключаецца ў тым, што ён зрабіў адлічэньне 5 проц. на абагуленую маемасьць з умоўна чыстага даходу, чым паменшыў 5 проц. фонд. **5 проц. для разьмеркаваньня сярод калгасьнікаў адпаведна абагуленай імі маемасьці трэба адлічаць ад валавога ўраджаю і прыбыткаў ад малочна-прадукцыйнай абагуленай жывёлы.**

Другая памылка калгасу «Расьсьвет—Пераможца» заключаецца ў тым, што ён устанавіў спажывецкія нормы для членаў калгасу. **Калгасы павінны ў абавязковым парадку здаваць (перадаваць) таварныя пішчы ў колькасьці 1/8 часткі валавога ўраджаю. Рэшта ўраджаю пасьля стварэньня насенных і кармавых фондаў разьмяркоўваецца паміж калгаснікамі.**

Калгас «Беларуская Вёска», Лучыцкага сельсавету (калгас зьмясьціў свой праект разьмеркаваньня ў газэце «Савецкая Беларусь» ад 22-VIII) зусім не адлічыў 5 проц. на абагуленую маемасьць з сумы, якая падлягала разьмеркаваньню, ня вылічыў гаспадарчых выдаткаў арцелі. Тое, што калгас «Беларуская Вёска» не адлічыў 5 проц. ад валавога ўраджаю і абагуленай малочна-прадукцыйнай жывёлы ў фонд для разьмеркаваньня паміж калгаснікамі, адпаведна абагуленай імі маемасьці,—зьяўляецца яго вялікай памылкай. **Другая памылка калгасу заключаецца ў тым, што ён ня вылічыў з валавога даходу арцелі гаспадарчых выдаткаў.**

Калі-б калгас разьмеркаваў свае прыбыткі без адлічэньня гаспадарчых выдаткаў, ён-бы гэтым самым разьмеркаваў паміж калгаснікамі частку асноўных капіталаў калгасу, што ні ў якім разе **нельга дапускаць.**

Дапусьціў памылку і калгас «Новы Шлях» (Сьмілавіцкі раён), які зьмясьціў свой праект разьмеркаваньня ў газэце «Беларуская Вёска» ад 13 жніўня. Памылка калгасу заключаецца ў тым, што ён залічыў у валавы прыбытак гаспадарчы прыбытку 1931 году, чым унесена блытаніна ў падлікі і павялічана сума, якая падлягае разьмеркаваньню паміж калгаснікамі.

Калгас «Паростак Сацыялізму», які зьмясьціў свой праект у газэце «Зьвязда», уключыў у гаспадарчыя выдаткі бягучага гаспадарчага году насенны і кармавы фонды на будучы год, чым паменшыў суму для разьмеркаваньня паміж калгаснікамі. Другая памылка калгасу заключаецца ў тым, што ён разьмеркаваньне зрабіў не па працаднёх, а запраектаваў налічэньне на рублі, умоўна запісаныя на рахунак калгаснікаў па тарыфнай сетцы. Гэта супярэчыць паказаньням аб разьмеркаваньні ўраджаю і прыбыткаў па працоўных днёх.

Правільна падышоў да разьмеркаваньня прыбыткаў і ўраджаю калгас «Ленінскі Шлях (Самахвалавіцкі раён), які зьмясьціў свой праект у газэтах «Зьвязда» і «Савецкая Беларусь» ад 4 жніўня. Практыку гэтага калгасу трэба скарыстаць іншым калгасам.

Паданыя факты з усёй выразнасьцю сьведчаць аб тым, што многія калгасы ня маюць належнай дапамогі з боку раённых арганізацый. Трэба мабілізаваць усе сілы на правядзеньне кампаніі па правільным разьмеркаваньні ўраджаю і прыбыткаў у калгасах. Дапушчаныя памылкі павінны быць рашуча выпраўлены. Вопыт лепшых калгасаў, якія правільна разьмеркавалі ўраджай, трэба шырока пашырыць.

Правільным разьмеркаваньнем ураджаю па колькасьці і якасьці працы панясем руйнуючы ўдар кулацкай агітацыі.

ЗАЛЕСКІ.

Заявы беднякоў пад сукном

Аздаравіць кіраўніцтва калгасу „Полымя"

СЕННА. (Брыгада «ЗЬВЯЗДЫ»). Калгас «Полымя» Сенненскага раёну, стаіць на парозе поўнага развалу. У калгасе няма ніякай арганізацыі працы. Уборачная кампанія знаходзіцца ў пагражаючым становішчы. Ураджай гніе на палёх. У калгасе парасло больш 3 гэкт. пасеваў ячменю, каля 7 га аўсу, згніло каля 20 тон сена. На сёнешні дзень у калгасе гніе пад дажджом каля 50 тон скошанага, але няўбранага сена. Азімае збожжа да гэтага часу ня зьвезена з поля.

Да асеньняй сяўбы калгас «Полымя» зусім не падрыхтаваўся. Плошча пад азімы клін не падрыхтавана. Абмалот яшчэ не распачаты. Інвэнтар зусім не адрамантаваны. Калгас мае сваю кузьню, але каваль скарыстоўваецца на палявых работах замест таго, каб рамантаваць с.-г. машыны.

Праўленьне калгасу праводзіць кулацкую палітыку, чакіраваную на развал арцелі. У калгасе пануе злачынная безгаспадарчасьць. Заявы беднякоў аб прыёме ў калгас марынуюцца цэлымі месяцамі. На заявы адзіноасобнікаў — беднякоў і сераднякоў праўленьне калгасу некалькі месяцаў не давала ніякага адказу. У калгасе моцна адчуваецца ўплыў мясцовага кулацтва. Зусім пэдаўна частка найбольш адсталых калгаснікаў, якія падпалі пад ўплыў мясцовых кулакоў, агітавала за прыём кулака Кармазіна ў калгас. Раённы камітэт партыі і райвыканком зусім ня цікавяцца становішчам калгасу. **Трэба неадкладна аздаравіць кіраўніцтва калгасу.**

Злачынное галавацяпства

Да адказу Белсельгасснаб!

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Раёны Гомельшчыны адчуваюць вялікую патрэбу ў с.-г. машынах. Калгасы і саўгасы машынамі не забясьпечаны. З Лоеўскага, Церахоўскага і іншых раёнаў паступаюць шматлікія запатрабаваньні на малатарні, арфы, сячкарні і г. д. Між тым, завоз машын у раёны Гомельшчыны злачынна ЗРЫВАЕЦЦА з-за бюракратычных адносін Белсельбанку. Да сёнешняга дня міжраённы склад Белсельгасснабу ў Гомелі не арганізаваны. Гэта ставіць пад пагрозу забясьпячэньне калгасаў і саўгасаў Гомельшчыны с.-г. машынамі.

Трэба адзначыць, што Белсельгасснаб у сваёй рабоце па забясьпячэньні Гомельшчыны с.-г. машынамі дапускае цэлы рад злачынных агідначасьцяй. Па віне Белсельгасснабу Гомельшчына атрымлівае малатарні без прывадных пасаў і таму яны ня могуць быць выкарыстаны. Яшчэ ў сьнежні мінулага году гомельскі акрпаляводсаюз даў заяўку Белсельгасснабу за № 8709 на 10 малатарань РАУ-23 з прывадамі да іх. Белсельгасснаб, пасылаючы заяўку для выкананьня украінскаму заводу с.-г. машын «КРАСНАЯ ЗВЕЗДА», ВЫКРЭСЬЛІЎ нарад на прывады. У выніку «Красная Звезда» прыслала малатарні БЕЗ ПРЫВАДОЎ. Такіх буйных складаных малатарань без прывадоў заслана ў Гомельшчыну 30.

Малатарні не скарыстоўваюцца і гэта ў самы разгар малацьбы. Калгасы ня маюць магчымасьці прыступіць да абмалоту, чакаючы прывадоў, а малатарні стаяць мёртвым грузам.

Белсельгасснаб, каб апраўдаць сябе, пайшоў на ашуканства і запэўніў гомельскі акрпаляводсаюз, што «Красная Звезда» павінна была прыслаць малатарні з прывадамі і што «гэтыя прывады вы атрымаеце». Аднак, завод «Красная Звезда» афіцыйна паведаміў (28 жніўня г. г.), што ён ня мог варажыць — ці патрэбны Белсельгасснабу прывады, ці не. Ніякага заказу на прывады завод НЕ АТРЫМЛІВАЎ. У выніку такой злачыннай нядбайнасьці Белсельгасснабу, 30 складаных малатарань СТАЯЦЬ БЯЗ УСЯКАГА РУХУ, а калгасы Гомельшчыны ня маюць чым абмалаціць збожжа.

Варта адзначыць, што такія факты не зьяўляюцца адзінкавымі ў дзейнасьці Белсельгасснабу. У Дняпроўскую камуну былі заслана трактарныя сявяркі без капёс.

ДА СУРОВАЙ АДКАЗНАСЬЦІ БЮРАКРАТАЎ З БЕЛСЕЛЬГАССНАБУ.

С — ў.

„Гігант" на праверцы

Справаздача калгасу перад адзінаасобнікамі

„Будзем разам з вамі будаваць калектыўную гаспадарку"

РЭЧЫЦА. (Наш спэцкар.). Холміцкі калгас «Гігант», Рэчыцкага раёну, распачаў справаздачную кампанію сярод адзіноасобнікаў. Калгас працуе ўжо 4 сходы, на якіх зрабіў справаздачу перад адзіноасобнікамі аб сваёй рабоце. «Гігант» азнаёміў адзіноасобнікаў са сваім праектам разьмеркаваньня ўраджаю і прыбыткаў. Справаздачныя сходы прайшлі з вялікім уздымам. Адзіноасобнікі, крытыкуючы калгас за асобныя недахопы, аднадушна адзначалі вялікія дасягненьні «Гіганта» ў будаўніцтве калектыўнае гаспадаркі.

Калгас «Гігант» ужо закончыў уборку ўраджаю. Убраны 80 га аўсу, 20 га грэчкі, 12 га ільну, уся сенажаць, убраны і абмалочаны ўраджай 14 га ячменю і г. д. Зараз «Гігант» разгарнуў шырокую падрыхтоўку да асеньняй сяўбы, якая пачынаецца гэтымі днямі. Плян сяўбы прапрацаваны на праўленьні і агульным сходзе калгаснікаў. У бягучым годзе калгас пашырае пасеўную плошчу на **10 проц.** Калгаснікі прыступілі да засыпкі насеннага фонду. Плошча пад азімы клін цалкам падрыхтавана. «Гігант» мяркуе аказаць значную дапамогу адзіноасобнікам у правядзеньні асеньняй сяўбы. Ужо зараз калгас аказвае дапамогу цягавай сілай адзіноасобнікам-беднякам.

На справаздачных сходах калгаснікі заявілі адзіноасобнікам, што іх гаспадаркі да аб'яднаньня ў калгас давалі прыбытак у 4-5 раз меншы, чым зараз, калі гэтыя-ж гаспадаркі калектывізаваны. Гэты факт зрабіў вялікае ўражаньне на адзіноасобнікаў, якія былі на справаздачных сходах. Адзіноасобнікі **Хапчык Уладзімер і Каваленка Фядос,** выказваючы думку ўсіх прысутных, заявілі:

— Сёньня мы яшчэ некалгасьнікі, але праз некаторы час мы бясспрэчна разам з вамі будзем будаваць калектыўную гаспадарку.

У часе асеньняй сяўбы калгас чакае масавай падачы заяў аб прыёме. Прыцёк у «Гігант» ужо пачаўся. Напярэдадні справаздачных сходаў у калгас паступіла **5** заяў аб прыёме. Зараз паступаюць новыя заявы.

Адначасова з арганізацыяй справаздачных сходаў, калгас «Гігант» прыступіў да здачы хлебных лішкаў дзяржаве. Прыкладу калгаснікаў пасьледвалі і адзіноасобнікі. **28 жніўня калгасьнікі і адзіноасобнікі вёскі Холмічы здалі каапэрацыі звыш 50 тон збожжа.**

А. КАЖАМЯКІН.



Рамонт лёкамабілю ў калгасе

ПЛЯНЫ МЯСАЗАГАТОВАК--

У СПРАВАХ РАХУНКАВОДАЎ

Загатоўленае для рабочых цэнтраў мяса і масла разбазарваецца ў раёнах

18,3 ПРОЦ.

Плян мясазагатовак па БССР за жнівень сарваны. Замест вызначаных 2.000 тон, **загатоўлена 367 тон, або 18,3 проц.**

Па асобных акругах лічба выкананьня пляну мясазагатовак яшчэ ніжэйшая. Так, па Бабруйскай акрузе плян мясазагатовак выкананы толькі на 15,7 проц., па Віцебскай—7,8 проц., Аршанскай—12,4 проц., Мазырскай—27,3 проц., Магілеўскай—2.2 проц. і Менскай—5,5 проц.

Усё яшчэ ня спынена разбазарваньне мяса на мясцовыя патрэбы. Барацьба са спэкулянтамі, з патаемным убоем жывёлы не праводзіцца. Цэлы рад раёнаў затрымлівае адгрузку жывёлы, якая вызначана для забясьпячэньня рабочых цэнтраў.

Усе гэтыя недахопы сьведчаць, што належнага пералому ў справе ўзмацненьня мясазагатовак яшчэ няма. Партыйныя арганізацыі яшчэ ня сталі на чале кіраўніцтва мясазагатоўкамі.

ПРЫКЛАД БЕЗАДКАЗНАСЬЦІ І БЮРАКРАТЫЗМУ

Прыкладам безадказных, бюракратычных адносін да справы мясазагатовак можа паслужыць Сураскае спажывецкае таварыства і Сураскі райкалгасаюз. У ліпені спажывецкае таварыства павінна было загатовіць 7,3 тоны мяса, загатоўлена-ж 1,4 тоны. У жніўні замест 8,7 тоны загатоўлена — 1,6 тоны.

Райкалгасаюз у ліпені замест 6,7 тоны, — 2,3, а ў жніўні замест 7,8 — 2,1 тоны.

Плян загатовак не даведзен да сельсавету і вёскі. Загатоўшчыкі ня ведаюць нават колькі яны павінны загатовіць. Цэны цэхамі тыдням ня бываюць на вёсцы і чакаюць пакуль селянін сам да іх прыедзе.

У цэнах на жывёлу і ў прэміяваньні наглядаецца розабой. Так, адны загатоўшчыкі за карову, якая каштуе 70 руб., даюць у якасьці прэміі боты, а іншыя, а[illegible] даюць яшчэ і 10 л[illegible] ня прытрымліваюцца вызначаных цэн. Ня гледзячы на тое, што спажывецкае таварыства загатовіла ў 6 раз менш вызначанага паводле пляну, прэміі ім ужо выдаткаваны больш, чым на палову.

У райкалгасаюзе нават ня вылучаны чалавек, які-б адказваў за ход мясазагатовак. Аб тым, колькі загатоўлена мяса ў жніўні, ніякіх вестак няма. Раймалжывсаюз, які раней вёў мясазагатоўкі, з 1 жніўня ліквідаваны, усе справы прыняў райкалгасаюз, але ніхто з супрацоўнікаў апошняга не пацікавіўся справай мясазагатовак. **Плян мясазагатовак увесь жнівень месяц праляжаў у справах рахункавода.**

Сураскі загатоўшчыкі не зрабілі ніякіх высноў з усіх вышэйпаданых фактаў. На верасень месяц пляны мясазагатовак таксама не даведзены да сельсавету і вёскі.

Брыгадзір «Зьвязды»

РАЁН БАЛОТ--БУДУЧАЯ КРЫНІЦА МАЛАКА І МЯСА

Камарынскі раён — адзін з самых далёкіх раёнаў БССР. Ён вострым клінам урэзваецца ў тэрыторыю УССР, паміж рэкамі Дняпром і Прыпяцьцю. Глеба раёну — пяскі, месцамі сыпучыя, а таксама непраходныя вялікія багны.

Балоты займаюць плошчу ў сотні кілёмэтраў і прыносяць вялікую шкоду пёмэтраў і прынесяць вялікую шкоду насельніцтву. Раён называецца жывёнасельніцтву. Раён называецца жывёлагадоўчым, але няма ў ім малака, зусім ніякая таварнасьць мяса.

На балотнай траве гадаваліся і расьлі толькі аялы, надзвычай худыя каровы. Балотнае сена выклікала розныя хваробы, ад якіх гінулі коні. Дробная гаспадарка не магла змагацца са стыхіяй бадарка не магла змагацца са стыхіяй балот, ня бачыла ніякіх перспэктыў.

Але няма такіх перашкод, якіх не магла-б перамагчы рабочая кляса, пад кіраўніцтвам партыі.

Пачалася ўжо рэальная работа па мэліярацыі і зямляўпарадкаваньні раёнаў. На асушаных балотах будуць створаны два саўгасы на 300.000 гэкт. На 1-га кастрычніка мінулага году ў раёне налічвалася 4 маленькіх калгасаў, якія аб'ядналі 1 проц. гаспадарак раёну. Зараз у раёне існуюць 25 калгасаў на 43% зямельнай плошчы, у якіх аб'яднана 26 проц. гаспадарак. Калгасы, арганізаваныя на аснове абагуленьня простых с.-г. прылад, ужо ў першы год існаваньня далі вялікі вытворчы эфэкт. Пасеўная плошча ў раёне пашырылася на 20 проц. Значна павысіўся ўраджай калгасаў. У гэтым годзе адны толькі калгасы дадуць дзяржаве бульбы ў два разы больш, чым даў у мінулым годзе ўвесь раён.

У бліжэйшыя гады пасеўная плошча раёну павінна павялічыцца ў чатыры разы.

К—ў.

ПАКРЫЦЬ ЖНІВЕНЬСКІ НЕДАБОР!

СЛУЧЧЫНА—ЖЫТНІЦА БССР ЗАГАТОВІЛА ТОЛЬКІ 3 проц. ЗАДАНЬНЯ

Кулак ня здаў ніводнага кілё хлеба

Загатоўшчыкі зрываюць арганізацыю чырвоных абозаў

СЛУЦАК (Брыгада «Зьвязды»). Слуцкі пункт «Союзхлеба» аб'ядная 7 раёнаў: Слуцкі, Старобінскі, Грэскі, Капыльскі, Чырвона-Слабодзкі, Стара-Дароскі і Любаньскі. Усе гэтыя раёны лічацца жытніцай БССР і здавалася-б, тым большая адказнасьць прыпадае на работнікаў Слуцкага пункту і мясцовыя арганізацыі.

Але апошнія недаацанілі ўмоў бягучай кампаніі хлебазагатовак і не падрыхтаваліся да яе.

Слуцкае аддзяленьне «Союзхлеб» на 3 верасьня выканала толькі 3 проц. зданьня па хлебазагатоўках. Зданы хлеб на 90-95 проц. — з калгасаў. Плян загатовак не давадзены да паасобнай вёскі, паасобнага кулацкага двара. Адзіноасобнікі па 6 раёнах здалі толькі 2 невялікія чырвоныя абозы.

Па Слуцкім раёне кулацтву вызначан тэрмін здачы толькі на 15 верасьня, і ТАМУ ДА СЁНЕШНЯГА ДНЯ КУЛАК НЯ ЗДАЎ НІВОДНАГА КІЛЕ.

Аддзяленьне «Союзхлеба» не атрымлівае ніякіх зводак аб тым, як паступае хлеб па раёнах. Работнікі «Союзхлеба» ня ведаюць, колькі ссыпных пунктаў у іх распараджэньні.

Не хапае складаў для зьмяшчэньня ўраджаю гэтага году.

Па пералічаных 7 раёнах у гэтым годзе павінны паступіць дзесяткі тысяч тон хлеба і бульбы, але мясцовыя арганізацыі нічога ня робяць, каб падрыхтавацца да іх прыёму.

Беднякі і сераднякі Старобінскага раёну, якія за 70 вёрст прывозяць у Слуцак хлеб, прымушаны ўпрашваць загатоўшчыкаў прыняць у іх хлеб, загатоўшчыкі пасьля доўгай цяганіны, бо «гэта фурманкі ня нашаг раёну», робяць сялянам ласку.

Вагі і тары ёсьць толькі 50 проц. патрэбнага ліку. Ніякіх мер да атрыманьня вагі і тары ня прымаецца.

Прасёлачныя дарогі ўсе ў ямах, ніхто ня зьбіраецца іх папраўляць. Не падрыхтавана да прыёму збожжа і станцыя Слуцак. Зусім мала на станцыі складаў. Райпаляводсаюзу і аддзяленьню Союзтрансу была даручана пэбудова адкрытай пляцформы на станцыі, але гэта пабудова сарвана з-за бюракратызму ППРІІ Дуткіна. Ён, у адказ на шматлікія запытаньні, дае тэлеграму: «работа па пабудове адкрытай таварнай пляцформы не прадугледжана, аб ёй першы раз чую». Між тым, пытаньне аб пабудове было ўзьнята яшчэ ў маі месяцы, былі падрыхтаваны матар'ялы і рабочыя рукі. Толькі зараз, пасьля адпаведнага націску, прыступлена да пабудовы пляцформы. Калі яна будзе гатова — адзін алах ведае.

Гарадзкое спажывецкае таварыства нічога не зрабіла, каб арганізаваць паркі і чайныя для сялян, якія прывозяць збожжа.

Ня трэба больш фактаў, каб прыйсьці да высновы, што ў асноўных хлебазагатоўчых раёнах пануюць бяздушныя, злачынныя адносіны да загатоўчай кампаніі.

Брыгадзір «Зьвязды»—
М. СКОБЕЛЕЎ.

НЕ ЗАБЫВАЦЬ, ШТО ВЕРАСЕНЬ—РАШАЮЧЫ МЕСЯЦ

БЕДНАТА НЯ ПРЫЦЯГНУТА ДА ЗАГАТОВАК.

Адміністраваньне замест работы з беднатой

КАСЬЦЮКОВІЧЫ. (Наш кар.). Дырэктывы партыі аб прыцягненьні беднаты і калгаснікаў да актыўнага ўдзелу ў хлебазагатоўчай кампаніі, ня выкананы большасьцю сельсаветаў раёну. Беднота не арганізавана. Пляны загатовак адразу выносяцца на абмеркаваньне агульных сходаў без папярэдняга абмеркаваньня на сходах беднаты. Гэтым карыстаецца кулацтва, якое імкнецца сарваць пляны загатовак.

У Батаеўскім сельсавеце беднота зусім ня прыцягнута да абмеркаваньня пляну. У выніку агульныя сходы ўхвалілі настанову: «унесьці, па меры магчымасьці, — пароўну». Пытаньне аб выбарах камісіі садзейнасьці зусім праваленa.

У вёсцы Бароўка, Студзеніцкага сельсавету, работа з беднатой ня была праведзена, гэта скарысталі кулакі і з-за агітацыі апошніх сход адмовіўся абгаварываць плян здачы хлеба.

Упаўнаважаны РВК ў адміністрацыйным парадку давёў пляны да гаспадарак, парушыўшы дырэктывы аб самаабавязацельствах бяднацка-серадняцкіх гаспадарак.

Не мабілізавана беднота для ўдару па кулацтве і ў Баронькаўскім, Забычанскім і Прусінскім сельсаветах.

У выніку ігнараваньня работы з беднатой і бязьдзейнасьці некаторых парт'ячэек, пляны яшчэ ня прыняты ва многіх пунктах і зусім не абмяркоўваліся на сходах калгаснікаў.

Трэба ўдарыць па тых, хто, ігнаруючы работу з беднатой, займаецца адміністраваньнем. Райком партыі павінен прыняць канкрэтныя меры для выпраўленьня дапушчаных памылак.

Д—і.

„Ёсьць больш важныя справы"

ПЛЯНЫ ЗАГАТОВАК НЯ ВЫКАНАНЫ

МСЬЦІСЛАЎЛЬ (Наш кар.). Раённа спажывецкае таварыства павінна было за жнівень загатовіць 38 тон збожжа, д[illegible] 1 верасьня загатоўлена толькі 18-1[illegible] тон.

Плян нявыканан таму, што мясцовы[illegible] партыйныя, савецкія і прафэсыянальныя арганізацыі не мабілізавалі грамадзкасьці вакол загатовак. Вельмі дрэнна працуюць камісіі садзейнасьці. Зусім н[illegible] разгорнута сацспаборніцтва паміж вёскамі і паасобнымі бяднацка-серадняцкімі гаспадаркамі. Не растлумачана інструкцыя Наркамгандлю аб прэміяваньні здатчыкаў.

Па Янаўскім сельсавеце плян не даведзен да вёскі і кулацкага двара. 8 кулацкіх гаспадарак сельсавету не атрымалі заданьня аб здачы хлеба. Старшыня сельсавету заяўляе, што «няма час займацца гэтым пытаньнем, ёсьць больш важныя справы».

Ёсьць выпадкі скрыўленьня клясовай лініі, калі пляны даводзіліся д[illegible] бяднацка-серадняцкіх гаспадарак.

Сходы жанчын наконт хлебазагатовак зусім не праводзіліся.

Спажывецкая каапэрацыя Мсьціслаўшчыны не падрыхтавала «ссыпны[illegible] пунктаў, не арганізавала культурны[illegible] чайных для абслугоўваньня здатчыкаў.

У вёску Пацалтава прыбыў чырвоны абоз з хлебам адзіноасобных гаспадарак, але каапэратары ня прынялі хлеба. Абозу прышлося-б варочацца назад, калі-б яго не перахапіў раённы пункт райпаляводсаюзу.

Справа гэта перадана судовым органам.

Пунктам спажывецкага таварыства в. Старое Сяло загатоўлены 2 тоны [illegible] бы. З-за нядбайных адносін загатоўшчыкаў частка бульбы папсавана.

Мсьціслаўскі гарсавет толькі 23 жніўня на пашыраным пленуме заслухоўваў даклад аб хлебазагатоўках, склаў камісію садзейнасьці, і ўстанавіў нават тэрмін давядзеньня пляну да вёсак і калгасаў—не пазьней 3-га верасьня, у то[illegible] час, калі Мсьціслаўскі РВК даў канкрэтны тэрмін давядзеньня пляну — [illegible] пазьней 20 жніўня.

Трэба прыняць тэрміновыя меры, каб ажыцьцявіць дырэктывы партыі і ўрада аб хлебазагатоўках. Час не чакае!

Шэсталапаў.

ВЫНІК ПАЛІТЫЧНАЙ БЛІЗАРУКАСЬЦІ

ЛАГОЙСК. (Наш кар.). Хлебазагатоўкі ўжо разгарнуліся ва ўсіх раёнах. Шмат у якіх мясцох ужо ёсьць значныя посьпехі, а Лагойская ячэйка толькі 26-га жніўня паставіла ў першы раз гэта пытаньне на абмеркаваньне. Плян загатовак да вёскі не даведзены. Цьвёрдыя нормы здачы хлеба кулацкімі гаспадаркамі не ўстаноўлены. Ніхто ня думае аб бальшавіцкіх мэтадах працы па загатоўках.

Стаўка на самацёк прывяла да вельмі дрэнных вынікаў. Жнівеньскі плян хлебазагатовак выкананы па 4 проц.— замест 7.380 пуд., сабрана 300.

Як выявілася, многія работнікі не даацэньваюць хлебазагатовак, як важнейшай палітычнай кампаніі. На сходзе, які ладзіўна адбыўся, чутны былі галасы, што плян вельмі вялікі і яго нельга выканаць.

Калі ў далейшым будуць гэткія тэмпы, дык плян загатовак па Лагойскім раёне, безумоўна, ня будзе выкананы. Трэба ўсе сілы кінуць па вёску, у калгасы, у бой за хлеб, супроць спроб кулака і спэкулянта сарваць кампанію!

В. РАСКІН.

ТРЫВОЖНЫ СЫГНАЛ

ПРАФРАБОТА НА БУЙНЕЙШЫМ ПРАДПЫЕМСТВЕ МЭТАЛІСТЫХ НЕ ПЕРАБУДАВАНА

ФАРМАЛЬНА--УСЁ ДОБРА, ПА СУТНАСЬЦІ--ПРАВАЛ

Перавыбарчая кампанія ФЗМК у гэтым годзе, як баявая палітычная кампанія, павінна была прыкаваць увагу ўсіх прафсаюзаў. Асабліва гэта датычыць саюзу мэталістых, які ў перабудове прафсаюзнай работы павінен служыць прыкладам і для іншых прафарганізацый.

Але матар'ялы праверкі, праведзенай прэзыдыумам ЦСПСБ, на паасобных прадпрыемствах саюзу мэталістых, паказваюць зусім процілеглы малюнак. Пакажам канкрэтна.

Ці ўдалося заўкому «Чырвоны Мэталіст» (Віцебск) замацаваць той уздым, які быў створаны сярод рабочых мас у часе перавыбараў? Адказ на гэта нам даюць наступныя лічбы: выкананьне прамфінпляну — красавік — май (пэрыяд сканчэньня перавыбараў) 100 проц., ліпень (праз месяц пасьля перавыбараў) рэзкае зьніжэньне — **85,5 проц.,** г. ан. недавыкананьне на 14,5 проц. І гэты прарыў на сёнешні дзень не ліквідаваны. Прагулы па нягрунтоўных прычынах, напрыклад, красавік (пэрыяд сканчэньня перавыбараў) — 0,51 проц., май — 1,49 проц., а па асобных цэхах — красавік 0,71 проц., май — 0,38 проц., чэрвень — 0,61 проц. (ліцейны цэх).

Мы маем таксама яўнае адставаньне (у паасобных цэхах) прадукцыйнасьці працы ад зарплаты. Возьмем ліцейны цэх.

Красавік. Зарплата 101,49 проц., прадукц. працы — 78,82 проц.; **Май** — зарплата — 99,15 проц., прадукц. працы — 66,27 проц.; **Чэрвень** — зарплата —109,98 проц., прадукц. працы — 73,54 проц.

Гэта паказвае, што ўздым у часе перавыбарчай кампаніі ня толькі ня быў скарыстаны, але нават трудна сказаць, каб гэта перавыбарчая кампанія стварыла перапом на заводзе. Якія тут прычыны? Галоўная прычынай зьяўляецца тое, што **ёзунг аб перабудове прафсаюзнай работы па-новаму,** заўком і ЦК саюзу мэталістых зразумелі па-свойму.

Арганізацыя сэктароў заўкому паказвае, што ні ФЗМК, ні цэхкамітэты, ні нават паасобныя работнікі ЦК ня ўсьвядомілі асноўнай задачы сэктароў і іх прызначэньня. Напрыклад, пры заўкоме ёсьць наступныя сэктары: 1) тарыфна - эканамічна - бытавы— арганізацыйны, 2) масава - эканамічны, 3) культрасьветы, 4) работы ў вёсцы, 5) выдвіжэньня і кадраў, 6) арганізацыйна - масавы і 7) каапэрацыйны. А па цэхах мы маем: 1) арганізацыйна-масавы, 2) культмасавы, 3) вытворча-эканамічны, 4) аховы працы. І вось такая блытаніна і паралелізм прывялі да таго, што сэктары існуюць фармальна, але не працуюць. Асноўная задача перабудовы работы прафсаюзаў заключаецца ў цырокім прыцягненьні актыву добраахвотнікаў. Але на заводзе «Чырвоны Мэталіст» заўком аб гэтым пазабыў. У цэхах былі паасобныя спробы арганізаваць добраахвотнікаў, але бяз посьпеху, бо адсутнасьць работы ў імі давяла іх да распаду. Такім чынам, атрымалася фармальная перабудова, зьмена назваў — замест старшыні камісіі — арганізатар сэктару.

Як стаіць справа з кіраўніцтвам з боку заўкому ніжэйшымі прафсаюзнымі на заводзе? Ці адчуваецца тут што-небудзь новае? Апрача фармальнага заслухоўваньня дакладаў цэхкамітэтаў на пасяджэньнях заўкому, без папярэдняй праверкі работы, без практычных паказаньняў у далейшым — нічога няма. Адчуваецца, што заўком не папярнуўся тварам да цэху і што цэх на сёнешні дзень не зьяўляецца цэнтрам прафработы.

Пытаньні сацспаборніцтва і ўдарніцтва на заводзе не, запостраны. Сацспаборніцтва не атрымала належнага размаху, кіраўніцтва амаль не адчуваецца. Пэрыяд ад перавыбарчай кампаніі (красавік) да XVI партзьезду (чэрвень) —ня даў новых кадраў ударнікаў. Толькі да XVI зьезду створаны 2 брыгады (14 чалавек) і за чэрвень месяц завербавана 9 брыгад з 52 чалавек. Хаця з 817 рабочых заводу ахоплены ўдарніцтвам 522 чал., але ўсё-ж не адчуваецца сапраўднага ўдарніцтва (характэрна, што з 263 чл. партыі, ахоплена 129 чал., з 65 камсамольцаў толькі 45). Ні адзін работнік адміністрацыйна - тэхнічнага персаналу не абвясьціў сябе ўдарнікам.

Слаба ведзецца барацьба з ілжэўдарніцтвам. Прэміяваньне лепшых ударнікаў, як герояў працоўнага фронту, не практыкуецца.

Такое кіраўніцтва сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам з боку заўкому робіць зразумелым, чаму на заводзе ня чуваць аб суцэрэчным прамфінпляне, грамадзкім буксіры, «сквозных» брыгадах і г. д.

У рабоце вытворчых нарад галоўным чынам, у перабудове іх работы таксама адчуваецца фармальны падыход. Заўком не растлумачыў рабочай масе значэньня гэтай перабудовы і што новага ўносіць ліквідацыя вытворчых камісіяў. Слабое скліканьне нарад (усяго за 4 месяцы былі адна агульна-заводзкая і 2 цэхавыя нарады), слабы ўдзел тэхнічнага персаналу (на 130 чал. удзельнікаў трох нарад — тэхперсаналу 2 чал.), — гаворыць за тое, што вытворчая нарада яшчэ не зьяўляецца тым цэнтрам, вакол якога павінны групавацца ўсе лепшыя рабочыя, лепшыя ударнікі.

Слаба стаіць справа з выкананьнем прапаноў рабочых, а таксама з выкананьнем настаноў **вытворчых нарад.** Яшчэ даўтуль не ўдалося ўрэгуляваць пытаньне аб назначэньні старшыні вытворчай нарады намесьнікам дырэктара, бо Белмэталяб'яднаньне ня хоча яго залічыць на пэнсію, лічачы гэтую пасаду «грамадзкай нагрузкай».

Пытаньні рацыяналізацыі, барацьба са стратамі і г. д. амаль не закранута. Наадварот, кідаюцца ў вочы такія ненармальнасьці, як няўвязка паміж цэхамі, нерацыянальнае скарыстаньне рабочае сілы. Напрыклад, на 1-й зьмене стаяць варыштаты з-за недахвату кваліфікаваных рабочых (такарна - механіч

Праект

СТАТУТ

раённага саюзу сельска-гаспадарчых калектываў*)

I. АГУЛЬНАЯ ЧАСТКА

1. Сельска-гаспадарчыя камуны, арцелі і таварыствы па сумеснай апрацоўцы зямлі . . . . . раёну БССР, аб'ядноўцца ў . . . . . раённы саюз сельска-гаспадарчых калектываў (райкалгассаюз).

Райкалгассаюз ажыццяўляе арганізацыйнае і вытворчае кіраўніцтва і абслугоўваньне калгасаў раёну, усямерна садзейнічае адзінаасобным сялянам арганізоўваць новыя калгасы і ўступаць у існуючыя, з мэтаю пагалоўнага ўцягненьня ў калгасы ўсіх батракоў, беднякоў і сераднякоў . . . . . раёну.

На аснове разьвіцьця самадзейнасьці і працоўнага ўздыму калгасьнікаў, райкалгассаюз арганізуе будаўніцтва высокатаварнае калектыўнае вытворчасьці з тым, каб ажыццявіць поўную перабудову сялянскае гаспадаркі на сацыялістычных пачатках і, такім чынам, забясьпечыць сапраўдную і поўную перамогу над кулаком, над усімі эксплёататарамі і ворагамі працоўных, сапраўдную і поўную перамогу над беднасьцю і адсталасьцю дробнае адзінаасобнае гаспадаркі.

2. Дзеля гэтага райкалгассаюз:

а) арганізуе машына-тэхнічную базу для калгасаў свайго раёну, прымае ўдзел у распрацоўцы пляну будаўніцтва машына-трактарных станцый, садзейнічае іх арганізацыі, арганізуе машына-забясьпячэньне калгасаў і кіруе правільным выкарыстаньнем с-г. машын і прылад, а таксама садзейнічае арганізацыі прамысловых прадпрыемстваў па пераапрацоўцы с-г. прадуктаў і дапаможных прадпрыемстваў (рамонтныя майстэрні і інш.) у калгасах;

б) кіруе калгасамі і садзейнічае ім у правільнай арганізацыі працы ў калгасах і найбольш поўным выкарыстаньні сваёй рабочай сілы шляхам разьвіцьця дадатковых галін сельскае гаспадаркі, промыслаў і адходу, а таксама садзейнічае правільнаму разьмеркаваньню прыбытку ў калгасах;

в) арганізуе вылучэньне арганізатараў і кіраўнікоў калгасьнікаў, калгасьніц і 25-цігысячнікаў, садзейнічае правільнаму падбору і навучаньню кіраўнікоў паасобных галін гаспадаркі, брыгадзіраў і г. д., арганізуе падрыхтоўку і перападрыхтоўку кваліфікаваных работнікаў і масавых кадраў;

г) садзейнічае правільнай арганізацыі вытворчасьці ў калгасах, кіруе складаньнем у калгасах вытворчых плянаў і рабочых праграм;

д) кіруе работай калгасаў па правядзеньні мерапрыемстваў па павышэньні ўраджайнасьці ў калгасах, арганізуе правядзеньне агра і зоамінімуму і пастаноўку найбольш поўнага агратэхнічнага абслугоўваньня калгасаў, садзейнічае зямляўпарадкаваньню калгасаў;

е) арганізуе крэдытаваньне калгасаў у адпаведнасьці з зацьверджанымі вытворчымі плянамі, садзейнічае арганізацыі збыту калгаснай прадукцыі праз каапэрацыю і дзяржаўныя органы;

ж) кіруе капітальным будаўніцтвам у калгасах;

з) садзейнічае калгасам у правільнай пастаноўцы рахункаводства і справаздачнасьці, ажыццяўляе кантроль і нагляд за эканомным выдаткаваньнем сродкаў у калгасах, вытварае рэвізіі работы калгасаў;

і) садзейнічае арганізацыі правільнай пастаноўкі ў калгасах культурнаасьветных і бытавых устаноў і мерапрыемстваў.

Усю сваю работу райкалгассаюз праводзіць на аснове арганізацыі шырокае масавае работы ў калгасах, арганізацыі батрацтва, беднаты і жанчын, разгортваньня работы вытворчых нарад, арганізацыі сацспаборніцтва і ўдарніцтва і садзейнасьці вакольнаму батрацкаму, бядняцкаму і серадняцкаму насельніцтву ў пераходзе да калектыўных форм гаспадараньня, шляхам аказаньня ім праз калгасы вытворчае дапамогі.

Абапіраючыся на актыўнасьць мас калгасьнікаў і адзінаасобнікаў, райкалгассаюз праводзіць мерапрыемствы па арганізацыі новых калгасаў і ўмацаваньні існуючых, садзейнічае іх перарастаньню ў вышэйшыя формы і плянавай арганізацыі на гэтай аснове ўсяе гаспадаркі раёну.

3. Райкалгассаюз уваходзіць членам у Беларускі Цэнтральны Саюз калектыўных гаспадарак (Белкалгаспэнтр).

4. Райкалгассаюз мае ўсе правы юрыдычнай асобы.

5. Райкалгассаюз мае пячатку са сваёю назваю.

6. Кіраўніцтва райкалгассаюзу знаходзіцца ў . . . . . .

II. ЧЛЕНЫ РАЁННАГА КАЛГАССАЮЗУ, ІХ ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ

7. Членамі раённага калгассаюзу могуць быць паасобныя сельска-гаспадарчыя камуны, арцелі і таварыствы грамадзкай апрацоўкі зямлі, а таксама куставыя аб'яднаньні іх.

8. Кожны калгас, які ўступае ў раённы калгассаюз, павінен падаць аб гэтым у кіраўніцтва саюзу сваю заяву і ўнесьці адпаведны ўступны ўзнос. Да заявы павінны быць прыкладзены: статут калгасу, копія пастановы агульнага сходу калгасьнікаў аб уваходзе ў саюз і справаздача за мінулы год.

9. Прыём калгасаў у члены райкалгассаюзу робіцца кіраўніцтвам райкалгассаюзу. Няпрыняцьце ў члены можа быць абскарджана на раённым зьезьдзе калгасаў.

10. Кожны член саюзу павінен плаціць штогодныя членскія ўзносы, разьмер якіх устанаўляецца раённым зьездам сельска-гаспадарчых калектываў.

11. Усе калгасы—члены райкалгассаюзу, абавязаны:

а) падпарадкавацца патрабаваньням статуту і выконваць пастановы раённага зьезду сельска-гаспадарчых калектываў і кіраўніцтва райкалгассаюзу;

б) весьці сваю гаспадарчую і арганізацыйную работу ў адпаведнасьці з агульнымі дырэктывамі райкалгассаюзу і пасылаць на зацьверджаньне райкалгассаюзу свае вытворчыя пляны, фінансавыя праграмы і справаздачнасьць па форме і ў тэрміны, устаноўленыя Белкалгасцэнтрам;

в) заключаць, пры садзейнасьці райкалгассаюзу, з сельска-гаспадарчымі каапэрацыйнымі арганізацыямі дагаворы (кантрактацыі) і адаваць (прадаваць) сваю таварную прадукцыю каапэрацыйным і дзяржаўным арганізацыям.

12. У выпадку парушэньня членамі сваіх абавязкаў, райкалгассаюз ужывае да няспраўных калгасаў меры арганізацыйнае і эканамічнае ўзьдзейнасьці, у тым ліку і зачыненьне крэдытаў, аж да выключэньня са складу членаў райкалгассаюзу.

III. СРОДКІ САЮЗУ

13. Сродкі раённага калгассаюзу складаюцца:

а) з уступных і штогодных узносаў членаў;

б) паступленьняў ад каапэрацыйных і дзяржаўных арганізацый на правядзеньне аграабслугоўваньня калгасаў;

в) адлічэньняў каапэрацыйных саюзаў па іх збыта-забясьпячальных апэрацыях з калгасамі;

г) асигнаваньняў з мясцовага і дзяржаўнага бюджэтаў і іншых паступленьняў.

14. Уступныя ўзносы для калгасаў устанаўляюцца ў . . . . . (процантаў) ад сумы ўступных узносаў, сабраных імі ад сваіх членаў.

15. Разьмер штогодных узносаў вызначаецца патрэбнасьцю прыбыткова-выдаткованага каштарысу па арганізацыйна-вытворчым абслугоўваньні калгасаў і ўстанаўляецца ў процантных адносінах да валавога ўраджаю і прыбытку ад іншых галін гаспадаркі калгасаў, з тым, аднак, што гэтыя адлічэньні ня могуць быць вышэй 1 проц. гэтых прыбыткаў. Разьмер адлічэньняў устанаўляецца штогод раённым зьездам с-г. калектываў.

IV. ОРГАНЫ КІРАВАНЬНЯ І КАНТРОЛЮ

16. Справамі райкалгассаюзу кіруе раённы зьезд с.-г. калектываў, а ў перыяд паміж зьездамі, абраныя зьездам кіраўніцтва. Органам кантролю зьяўляецца рэвізійная камісія.

17. У органы кіраўніцтва і кантролю саюзу ня могуць быць абраны асобы, пазбаўленыя выбарчых правоў у саветы.

А. РАЁННЫ ЗЬЕЗД КАЛГАСАЎ

18. Раённы зьезд с.-г. калектываў зьяўляецца вышэйшым органам Райкалгассаюзу і аб'яднаных у ім с-г. калектываў. Ён вырашае важнейшыя пытаньні арганізацыі і дзейнасьці саюзу, разглядае і зацьвярджае плян дзейнасьці саюзу, прыбытковы і выдатковы каштарыс і гадавую справаздачу, устанаўляе разьмер членскіх узносаў і тэрміны аплаты іх, зацьвярджае інструкцыі па работе кіраўніцтва і рэвізійнай камісіі, абірае кіраўніцтва і рэвізійную камісію, а таксама дэлегатаў на ўсебеларускі зьезд с.-г. калектываў, і вырашае іншыя пытаньні, якія ўносяцца на разгляд зьезду па пастанове кіраўніцтва, рэвізійнай камісіі, а таксама па патрабаваньні членаў саюзу.

19. На раённы зьезд с.-г. калектываў кожны калгас пасылае сваіх прадстаўнікоў па разьліку: ад камун—па адным прадстаўніку на кожныя . . . членаў, ад с.-г. арцелі—па адным прадстаўніку на кожныя . . . . . членаў і ад таварыстваў грамадзкай апрацоўкі зямлі—па адным прадстаўніку на кожныя . . . . членаў, але ня менш, як па адным прадстаўніку ад кожнае арганізацыі.

Раённы зьезд с.-г. калектываў лічыцца законным, калі на яго зьявіліся прадстаўнікі ня менш, чым ад паловы ўсяго складу членаў саюзу.

20. Пастановы раённага зьезду с.-г. калектываў прымаюцца адкрытым галасаваньнем і простай большасьцю галасоў прысутных на зьезьдзе прадстаўнікоў.

21. Аб часе і месцы зьезду калгасаў, а таксама аб пытаньнях, якія ўносяцца на яго разгляд, члены саюзу павінны быць паведамлены асобнымі абвесткамі не пазьней, як за пятнаццаць дзён да дня зьезду.

Б. КІРАЎНІЦТВА

22. Кіраўніцтва райкалгассаюзу складаецца: з старшыні і ня менш чым з двох членаў і двох кандыдатаў да іх, якія абіраюцца на раённым зьезьдзе калгасаў тэрмінам на два гады.

23. Кіраўніцтва вядзе ўсе справы саюзу і прадстаўляе яго без асобнае на тое даверанасьці ва ўсіх яго зносінах з усімі ўстановамі і асобамі. На кіраўніцтва ўскладаецца:

а) прыманьне, выдача і захаваньне грошай, каштоўнасьці і іншай маемасьці саюзу;

б) заключэньне дагавораў і выдача абавязацельстваў, у тым ліку вэксалёў;

в) вядзеньне ўсіх забясьпячальна-збытавых апэрацый саюзу;

г) складаньне пляну калгаснага будаўніцтва раёну, пляну дзейнасьці, каштарысу, гадавое справаздачы і балянсу саюзу;

д) прадстаўніцтва інтарэсаў раённага калгассаюзу, куставых аб'яднаньняў калгасаў і паасобных калгасаў у судовых, адміністрацыйных, грамадзкіх і іншых установах;

е) правядзеньне абсьледваньняў, інструктаваньня і рэвізіі членаў саюзу;

ж) прыманьне служачых саюзу і іх звальненьне;

з) выдача даверанасьцяй на справах раённага калгассаюзу і для абароны і прадстаўніцтва інтарэсаў членаў;

і) нагляд за выкананьнем членамі саюзу дагавораў, абавязацельстваў і пастаноў зьездаў калгасаў;

к) прыём новых членаў у саюз;

л) усе іншыя пытаньні, якія вынікаюць са статуту саюзу і пастаноў зьездаў калгасаў і дырэктыў вышэйшых органаў.

24. Кіраўніцтва абірае са свайго складу старшыню і яго намесьніка і разьмяркоўвае паміж сваімі членамі абавязкі па вядзеньні спраў саюзу.

Члены саюзу могуць быць датэрмінова адкліканы паводле пастановы зьезду с.-г. калектываў.

25. За страты, зробленыя саюзу, з прычыны парушэньня кіраўніцтвам сваіх абавязкаў, члены кіраўніцтва адказваюць салідарна.

В. РЭВІЗІЙНАЯ КАМІСІЯ

26. Рэвізійная камісія абіраецца на раённым зьезьдзе с.-г. калектываў тэрмінам на два гады і складаецца ня менш, як з трох членаў і двох кандыдатаў да іх.

27. Рэвізійная камісія правярае ўсю работу кіраўніцтва і справаздачнасьць па яго справах. Рэвізійная камісія павінна ня менш двох раз на год абсьледваць становішча спраў саюзу, рахункаводства і справаздачнасьці і сваё заключэньне далажыць раённаму зьезду с.-г. калектываў. Апрача таго, рэвізійная камісія разглядае гадавую справаздачу і прыбыткова-выдатковы каштарыс саюзу і дакладвае раённаму зьезду с.-г. калектываў сваё заключэньне.

V. СПРАВАЗДАЧНАСЬЦЬ САЮЗУ

28. Справаздачны год саюзу пачынаецца па з 1-га студзеня і канчаецца 31-га сьнежня.

Не пазьней двох месяцаў па сканчэньні справаздачнага году, кіраўніцтва складае за подпісам сваіх членаў падрабязную справаздачу аб дзейнасьці саюзу, якая правяраецца рэвізійнай камісіяй і ўносіцца на зацьвярджэньне раённага зьезду с.-г. калектываў.

*) Друкуецца ў парадку абгаварэньня.

ЗЬВЯЗДА

Шкоднікі рабочага забесьпячэньня—перад Вярхоўным судом

Допыт сьведак

На вячэрнім пасяджэньні 6 і на раніцы—7-га верасьня працягваўся допыт сьведак.

Паказаньні раду сьведак даводзяць тое, што зусім не «аб'ектыўныя прычыны», як гэта стараліся давесьці абвінавачаныя, а работнікі вінаваты ў зрыве забесьпячэньня гароднінай.

Сьведка **Клябанаў** расказвае пра безгаспадарчасьць, якая панавала на

Падсудны Бярозкін

фруктова - гародняй базе. Мяшкі з гароднінай звальваліся пад вадастовыя трубы. У часе дажджу вада сьцякала на мяшкі. Бульба пачынала гніць, а па яе навальвалі яшчэ і яшчэ новыя мяшкі з бульбай. Так рабілася на працягу двух тыдняў.

На прапановы рабочых кіраўнікі базы не зьвярталі ўвагі. Калі рабочая брыгада наведала базу, загадчык базы Бярозкін загадаў накрыць гнілую бульбу, каб схаваць ад грамадзкасьці тыя непарадкі, якія былі на базе.

Члены мясцкому не адзін раз рабілі заўвагі Бярозкіну, паказваючы на тыя непарадкі, якія былі на базе, але Бярозкін адказваў: «мясцком умешваецца не ў свае справы».

Аб парадку прыёму заказаў расказвае сьведка **Філіановіч**. Калі загадчыкі крам давалі заказы на гародніну загадзя ўвечары, база гэтыя заказы ня прымала, між тым, гэта дапамагло-б урэгуляваць дастаўку.

Капуста і гуркі дастаўляліся ў крамы сапсаваныя — з вялікім процантам браку. Складчыя памяшканьні крам, у якія можна было ссыпаць шмат бульбы і гэтым самым паменшыць нагрузку базы — ня выкарыстоўваліся.

Тады, калі адпраўка бульбы на Менск была злачынна спынена, кіраўнікі фруктова - гароднінным аддзелам ЦРК не арганізавалі прыёмкі бульбы, якая прывозілася з прыгарадных гаспадарак на фурманках. Пра гэта расказвае сьведка **Рубен**.

13 жніўня з Астрашыцка - Гарадзецкага раёну ў Менск калгасьнікі прывезьлі 5 вазоў бульбы. Гэту бульбу доўга вазілі па горадзе і, не знайшоўшы каму яе адаць, зноў павезьлі ў Астрашыцкі Гарадок. У гэты час рабочы спажывец прымушаны быў купляць бульбу на рынку па падвышанай цане. Сьведка **Розін** расказаў пра тое, што часта са складу гуркі адпраўляліся ў мяшкох з-пад солі. Цьвятную капусту накладвалі на фурманкі, а на яе клалі скрыні з яблыкамі. Вядома, што капусту прывозілі ў краму сапсаванай.

З дасланых у адну краму 1.400 кгр. бульбы, 350 аказалася гнілой.

— Калі-б ЦРК своячасова даў распараджэньне аб аднаўленьні адгрузкі бульбы на Менск, прарыву ня было-б, —кажа сьведка **Прэабражэнскі**.

Сьведка **Кумкес**, адказваючы на запытаньне пракурора, проста адказаў: «пляны загатовак зусім рэальныя, прарыў быў зроблены выключна па віне работнікаў ЦРК». Гэты-жа сьведка ахарактарызаваў падсудныя Вальфсона, як беззаганнага работніка, якога ў часе чысткі ставілі ў прыклад іншым інструктаром, які дапамагаў і вучыў вылучэнцаў.

***

На вячэрнім пасяджэньні 7 верасьня пачаліся спрэчкі бакоў.

Пракурор т. КУРАЦКІН, кваліфікуючы злачынства абвінавачанага БУЖЫНА па 69 арт. Крымінальнага Кодэксу, патрабаваў для яго ня менш 8 год пазбаўленьня волі.

БЯРОЗКІНА пракурор лічыць вінаватым у нядбайнасьці, агідных адносінах да справы і патрабаваў для яго пазбаўленьня волі на тры гады.

Вылучэнец ЮДОВІЧ, які не рэагаваў па-бальшавіцку на безгаспадарчасьць і безадказнасьць, што панавалі ў забесьпячэньні гораду гароднінай, павінен быць ўмоўна пакараны.

У дзеяньнях Вальфсона і Гордзіна пракурор ня бачыць складу крымінальнага злачынства і лічыць магчымым абмежавацца ў адносінах да іх толькі мерай папярэджваючага характару.

Я. С.

Па БССР рэалізавана пазыкі на 9.537.000 руб.

Паводле даных Наркамфіну, на 1 верасьня па БССР рэалізавана аблігацый пазыкі «Пяцігодка—за чатыры гады» на 9.537.000 руб.—64 проц. кантрольнай лічбы.

Сярод рабочых і служачых рэалізавана 8.255.000 — 75 проц., сярод сялян—706.000—28,3 проц., сярод неарганізаванага насельніцтва — 527.000—40,5 проц. заданьня. З гарадоў на першым месцы па рэалізацыі пазыкі сярод рабочых і служачых ідзе ВОРША — 121 проц. кантрольнай лічбы.

Праверыць работу камісій садзейнасьці

З пастановы ЦВК БССР

Прэзыдыум ЦВК БССР заслухаў даклад цэнтральнай камісіі садзейнасьці дзяржкрэдыту аб рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка — за чатыры гады».

Добра выконваюць заданьні па пазыцы — г. Ворша (121 проц.), Асіпавіцкі раён (102 проц.), Крычаўскі раён (89,8 проц.), г. Бабруйск (84 проц.).

Зусім дрэнна выконваюць заданьні Крупскі раён (14 проц.), Церахоўскі і Заслаўскі (каля 30 проц.).

Прэзыдыум ЦВК БССР адзначыў ЗУСІМ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧУЮ РЭАЛІЗАЦЫЮ ПАЗЫКІ НА ВЁСЦЫ, што тлумачыцца слабай увагай з боку раённых выканаўчых камітэтаў і саветаў і нездавальняючай работай камісій садзейнасьці.

Прэзыдыум ЦВК прапанаваў усім райвыканкомам і саветам БССР тэрмінова праверыць работу камісій садзейнасьці, пераабраць камісіі, якія бязьдзейнічаюць, ужыць усе захады да пасьпяховай рэалізацыі пазыкі.

У прэзыдыуме ЦВК

Як выкананы дзяржаўны бюджэт БССР за 1928-29 год

Прэзыдыум ЦВК БССР заслухаў даклад СНК аб выкананьні дзяржаўнага бюджэту БССР за 1928-29 год.

Па дзяржаўных прыбытках паступіла 83.543 тысячы, выдаткавана 97.738 тыс., прыбытковая частка выканана з перавышэньнем на 3,6 млн., або на 4,6 процантаў.

У 1928-29 годзе значна павялічаны выдаткі на сацыяльна - культурныя патрэбы — на 27,7 проц. параўнальна з 1927-28 годам. Пры выкананьні бюджэту былі ажыццёўлены дырэктывы ўраду аб накіраваньні бюджэтных сродкаў на разьвіцьцё народнай гаспадаркі, павялічэньне ўдзельнае вагі аграмаджанага сэктару і г. д.

Прэзыдыум ЦВК зацьвердзіў пастанову СНК па дакладу аб выкананьні бюджэту і пастанавіў унесьці гэта пытаньне на бліжэйшую сэсію ЦВК БССР.

Назначэньні

Тав. **Майзіт Е. І.** назначана намесьнікам старшыні камітэту па паляпшэньні працы і быту рабочых і сялянак пры прэзыдыуме ЦВК.

Тав. Майзіт да апошняга часу працавала на партыйнай рабоце ў Полацку.

Ад'езд тав. Чарвякова ў раёны БССР

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР тав. **А. Г. Чарвякоў** выехаў у раёны БССР для азнаямленьня з іх работай, у сувязі з ліквідацыяй округ.

АД РЭДАКЦЫІ

Ва ўчарайшым нумары «Зьвязды» абураючым чынам скажана (пры наборы і праўцы ў друкарні) абвестка аб пахаваньні рабочага Менбуду т. Бернштэйна.

Вінаватым у гэтым наборшчыку і вярстальшчыку, якія ня выправілі, згодна паказаньня нарэктароў, тэксту заметкі, абвешчана суровая вымова з папярэджаньнем.

Адміністрацыя і грамадзкія арганізацыі друкарні мабілізуюць увагу рабочых і служачых на зьнішчэньне тых тэхнічных памылак, якія наглядаюцца ў апошні час.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

— Кастрычніцкі РК КП(б)Б склікае сёньня, а 6 гадз. веч., у памяшк. РК КП(б)Б нараду сакратароў вузаўскіх ячэек і кіраўнікоў навуч. устаноў. Яўка на нараду абавязкова і без спазьненьня.

— Пэдгабінэт. Сёньня, а 19 гадз. адбудзецца сход настаўнікаў III груп.

— Дом Асьветы. 9 верасьня для членаў саюзу працасьветы ў тэатры Прафінтэрн» адбудзецца спэктакль балету дзярж. маскоўскай студыі імя Айсэдоры Дункан. Білеты штодзенна ў канцылярыі Дому Асьветы з 11 да 2 і з 6 да 10 гадз.

— Менская біржа працы абвяшчае, што з 10 верасьня пачынаецца перарэгістрацыя ўсіх беспрацоўных, якія лічацца на вучоце вытворчай і разумовай сэкцый, а таксама ўсіх беспрацоўных жанчын жаночай сэкцыі. Парадак перарэгістрацыі наступны: 10—11 верасьня ад 9 да 12 гадз. — разумовая сэкцыя; 12—13 верасьня ад 9 да 12 гадз. — вытворчая сэкцыя і спазьніўшыяся. Па жаночай сэкцыі: 10 верасьня — з літ. «А» па літ. «О» укл.; 11 верасьня — з літ. «П» да канца альфабэту; 12 верасьня ўсе спазьніўшыяся па грунтоўных прычынах. Беспрацоўныя, якія не зьявяцца на перарэгістрацыю, будуць зьняты з вучоту біржы працы.

Час. вык. абав. адказ. рэдактара А. МІТЛІН.

КЛЮБ ДРУКАРОЎ.

У чацьвер, 11 верасьня а 7 гадз. веч. адбудзецца

АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІ ЗЬЛЁТ РАБКОРАЎ.

У парадку дня: даклад аб адозьве ЦК УсеКП(б) ад 3 верасьня і задачы рабкораў. Пасьля дзелавой работы—кіно.

На зьлёт запрашаюцца ўсе члены рэдкалегій, шматтыражак, насьценных газэт, рабкоры, сьпенкоры, вайскоры і юнкоры.

Сэктар масавай работы рэдакцыі газ. «Зьвязда».

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР

З верасьня

„АВАНГАРД" п'еса ў 4-х дзеях. В. Катаеў.

Пастаноўка С. Разанава і К. Саньнікава. Мастак Ю. Гольц. Музыка В. Салалова. Дырыжэр І. Гітгарц. Кіраўнік хору М. Кауфман. Пераклад сядзе С. Калпашнікаў.

Пачатак роўна а 8 з пал. гадз. | Білеты прадаюцца ў касе тэатру, у рабочай касе і на Усебеларускай выстаўцы.

Мастацкі ЦЫРК | Пад кіраўніцтвам І. Л. СТРАШЭВІЧА

У ПАНЯДЗЕЛАК, 8 верасьня

ВЫДАТНАЕ ЗРЭЛІШЧА

Вялікая розгластайная праграма

ШМАТ ВЫДАТНЫХ №№

Гастролі папулярных сатырыкаў БІБ І БОБ

Новы злобадзённы жанр

— Пачатак а 8 г. 30 м. —

Каса адкрыта з 12 да 2 і з 5 г. Рабочая каса з 12 да 2 і з 4 да 6 г. Адказны кіраўнік І. Л. СТРАШЭВІЧ.

АНОНС! Едзе новы склад трупы

Кіно „СПАРТАК"

З панядзелка, 8 верасьня

З прычыны вялікага посьпеху

2-гі ТЫДЗЕНЬ 2-гі

дэманструецца нашумеўшы фільм

ВАР'ЕТЭ

драмаў 7 частках.

Пачатак сэансаў: 7 г., 9 г., 10 г. 45 м.

КАСА —ад 6 гадз.

БЕЛАРУСКАМУ ДЗЯРЖАЎНАМУ ВЫДАВЕЦТВУ ПАТРАБУЕЦЦА ГАЛОЎНЫ БУХГАЛЬТАР

З САЛІДНЫМ СТАЖАМ.

Аплата па згодзе.

Зьвяртацца: Менск, Савецкая, 63. Беларыжвыдавецтва.

Прыём заяў у Гомельскі Агра-Пэдагагічны Інстытут ПРАЦЯГНУТ да 20-га верасьня.

Прыём іспытаў і запічэньне адбудзецца з 25-га верасьня па 1-е кастрычніка.

Дырэктар інстытуту ЕРМАКОЎ.

Беларуская краёвая кантора саюзтрансу НКШЗ адкрывае на ст. Менск-тав.

ТЭХНІКУМ транспортна-экспэдыцыйнай і складской спэцыяльнасьцяй.

Прымаюцца асобы,—скончыўшыя 7-годку, ШСМ, 9-годку, агульныя адукацыйныя курсы на базе 7-годкі і курсы па падрыхтоўцы ў тэхнікумы на агульных падставах, устаноўленых НКА для тэхнікумаў. Прыём заяў праводзіцца ДА 15 ВЕРАСЬНЯ ў памяшканьні школы № 3 (б. 9-годкі) на ст. Менск-тав.

65 проц. студэнтаў забясьпечваюцца стыпэндыямі у 40 р.

Кіно „Пралетары" Кіно „Юны Піянэр"

З ПАНЯДЗЕЛКА, 8 ВЕРАСЬНЯ

СУСЬВЕТНЫ ФІЛЬМ

БРАНЯНОСЕЦ ПАЦЁМКІН

Частка 1-я—ЛЮДЗІ І ЧЭРВІ
» 2-я—ДРАМА НА ТЭНДЭРЫ
Частка 3-я—МЁРТВЫЯ ГУКАЮЦЬ
» 4-я—АДЭСКІЯ СХОДЫ
Частка 5-я—АДЗІН НА ЎСІХ

ПАЧАТАК 1-ГА СЭАНСУ А 7 ГАДЗ. КАСА АДКРЫТА АД 5 ГАДЗ.

ПАЧАТАК 1-ГА СЭАНСУ А 2 Г. ДНЯ КАСА АДКРЫТА З 12 Г.

Кіно-тэатр „КУЛЬТУРА".

З панядзелка, 8 верасьня

Мастацка-гістарычны фільм вытворч. Саюзкіно 1930 г.

ПАБЕГ 10 СЬМЕРТНІКАЎ З ВАРШАЎСКАЙ ТУРМЫ

Рэж. Н. Краўчукоўскі.
Сцэнарысты Г. Грэбнеў.
Апэратар Н. Юдзін.
Мастак В. Рахальс.

У гал. ролі народная артыстка О. КНІПЭР-ЧЭХАВА.

Каса адкрыта ад 5 гадз.

Пачатак сэансаў а 7 г., 8 г. 40 м. і 10 г. 20 м.

Спазьніўшыяся на сэанс позьні 15 мін. у залю не дапускаюцца.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ".

З панядзелка, 8-га верасьня

Мастацкі фільм паводле тэмы П. І. ТРЫФОНАВА

Сорамна Сказаць

драма ў 6 частках.

У гал. ролях: П. САВІН, Л. САФРОНІН, В. МАРЭЦКАЯ.

Пачатак 1 сэансу а 7 гадз. Каса адкрыта ад 5 г.

На падставе распараджэньня Менскага Гарадзкога Савету прапануецца ўсім работнікам б. акруговых устаноў,

явія навіроўваюцца для працы ў раёнах,

ЗАЙМАНЫЯ ІМІ КВАТЭРЫ І ПАКОІ ЗДАЦЬ МЕНКАМГАСУ.

Адносна тых работнікаў, якія ўхіляцца ад здачы памяшканьняў у Камгасу, а самачынна перададуць іх іншым асобам, у адпаведных органах будзе пастаўлена пытаньне аб прыцягненьні да адказнасьці.

Домакіраўніцтва і домаўласьнікі ні ў якім разе не павінны допушчаць засяленьня ашабаняемых работнікамі, адпраўджаючымі ў раёны і іх сем'ямі, памяшканьняў іншымі асобамі, якія ня маюць ордэраў жылстала Камгасу.

У выпадку невыкананьня гэтай прапановы домакіраўніцтва і домаўласьнікі будуць несьці адказнасьць аднолькавую з асобамі, самачынна перададзенымі жыллаплошчу.

Менкамгас.

МЕНСКАЯ прафтэхшкола агнятрывалага будаўніцтва (на базе 7-годкі)

АБВЯШЧАЕ

ДАДАТКОВЫ ПРЫЁМ ЗАЯЎ

ад рабочых, батракоў і сялян—беднякоў, серадняковаў, калгасьнікаў.

Прафтэхшкола рыхтуе малодшых адміністрацыйна-тэхнічных пэрсанал па агнятрывалым будаўніцтве.

Умовы прыёму, згодна даведніка НКА. 60 проц. вучняў будзе забясьпечана стыпэндыяй і інтэрнатам.

Заявы прымаюцца да 20-га верасьня ў канцылярыі школы (Савецкая, 113) з 12 да 5 гадз. дня. Заняткі ў школе пачнуцца 1-га кастрычніка.

Зав. школы Жаўрыд.

Галоўнае кіраўніцтва шосавых і грунтавых дарог і аўтатранспарту БССР паведамляе, што ў 1930-31 навуч. годзе ў г. Менску

АДКРЫВАЕЦЦА АУТАТЭХНІКУМ

тэрмінам навучаньня 2½ гады.

ПРЫЁМ ЗАЯЎ ПРАЦЯГНУТ ДА 10 ВЕРАСЬНЯ

Тэхнікум рыхтуе тэхнікаў па аўта-экспляатацыі.

Прымаюцца асобы, скончыўшыя сямігодкі або вячэрнюю школу павышанага тыпу.

Прыём заяў у памяшканьні 7-ай школы (Камсамольская вул. д. № 40).

Прыём на агульных падставах, устаноўленых НКАсьветы для тэхнікумаў.

Выкладаньне на нямецкай мове.

Частка слухачоў будзе забясьпечана стыпэндыяй.

Галоўдартранс БССР.

АДДЗЕЛ КАДРАЎ ВСНГ БССР

паведамляе, што ў сувязі са скачэньнем работы прыёмовых камісій пры хам.-тэхналёгічным, будаўнічым, электратэхнічным і механічным інстытутах,

у ВСНГБ утворана

АПЭЛЯЦЫЙНАЯ КАМІСІЯ

па разглядзе апэляцый і скаргаў на рашэньні прыёмовых камісій.

Апошні тэрмін падачы апэляцый і 3 верасьня, пасьля якога ніякія заявы і скаргі прымацца ня будуць.

Вачэрні сэктар Камуністычнага Унівэрсытэту Беларусі імя У. І. ЛЕНІНА

абвяшчае, што 10, 11 і 12 верасьня будуць праводзіцца ПРЫЙМОВЫЯ ІСПЫТЫ для тых т.т., якія яшчэ не праходзілі іспытаў па якіх небудзь прычынах.

Адначасова праходзяць іспыты т.т., паступаючыя на вячэрнія курсы камсамольскага актыву.

Адносна пачатку заняткаў у вячэрнім камвузе будзе абвешчана асобна.

Заочные Госкурсы Росписи

(РАЗРИСОВКИ) по всевозм. тканям. Красками: рельефн., масляк., эмалев. Брызгами. Прысыпками: сверкающ., бисер, жемчуге и др. Способы: не расплыв. анилина, прозрачн. по-писи мягкого золота, цветного серебра. Роспись глинян., стеклян. сосудов, целлулоида, кожи, дерева. К урокам прилагается свыше 200 рис. (кроме текстовых).

По окончании выд. свидетельство. Умение рисов. не требуется.

Подробности высыл. за 20 к. мелк. почт. марками

МОСКВА, ул. Дзержинского, д. № 1. ЗАОЧНЫЕ КУРСЫ СОНО.

Заочныя бухгальтарскія курсы

Прыём слухачоў праводзіцца круглы год.

Прымаюцца асобы з 17-гадовым узростам з асьветай ня ніжэй 5 гр. 7-годкі.

ПЛАТА ЗА КУРС 33 руб.

праводзіцца так: 9 руб. пры паступленьні на курсы, з якіх 4 руб. залічваюцца за 8-ы месяц і па 4 руб. на працягу 6 месяцаў у пачатку кожнага навучальнага месяца

Заявы, запытаньні і грошы накіроўваць на адрасе: Менск, пошта, скрынка 44, Заочным курсам.

На адказ прыкладаць 2 маркі па 10 кап.

50 К. кошт публікацыі аб згубе дакуманту

Друкарня газ. «Зьвязда», Менск.

Менск. Галоўлітбел 337.